Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

СЛОВА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 1 Вільня, Пятніца 5-га кастрычніка 1928 г. Год 1

У гэтым нумары 6 страніц.

Да зьезду Т-ва Беларускае Школы.

З году на год павялічваецца наступ буржуазіі на беларускія школы ў роднай мове. У апошні год, апрача некалькіх „падараваных“ школаў з вучыцялямі — галілеюшамі, асталіся толькі чатыры беларускіх Гімназіі. Але ў гэтым годзе прыйшоў і на іх чарод. Нарэшце маем факт „завешаньня“ і „адвешаньня“ Галоўнай Управы Т-ва Бел. Шк. Як відно, дык усьлед за палітычнай барацьбой — пачалася барацьба і на культурным фроньце.

Добра ведаем аб тым, што Т-ва Бел. Шк. ёсьць арганізацыяй чыста культурнай і што гэта ёсьць у сучасны мамэнт адзіная арганізацыя, якая шырыць асьвету ў найбольш занядбаных закутках вёсак і мест, дзе так адчуваецца голад навукі ў роднай мове. Стыхійны парыў да барацьбы з палянізацыяй за школу і культуру ў роднай мове, а таксама той факт, што Т-ва Бел. Школы было на вышыні свайго заданьня і было выразіцелем глыбока заложаных патрэб і імкненьняў беларускіх працоўных гушчаў — гэтыя чыньнікі зрабілі з Т-ва Бел. Шк. арганізацыю масавую, як па ліку сяброў, гэтак і ў характары дзеяльнасьці. Гэтым самым кожная атака на Т-ва Бел. Шк. ёсьць разам з тым атакай на шырокія беларускія працоўныя гушчы, адбіраючы ў іх навет надзеі на родную школу і магчымасьць нявіннай культурнай працы.

Польская буржуазія пасільвае свой націск на Т-ва Беларускае Школы пры чыннай спосупрацы беларускіх здраднікаў, спад знаку „Гаспадарчага Зьвязу“ і прыхільных яму элемэнтаў з б. сяброў самога Т-ва. Гэта-ж ніхто іншы, як падобныя здраднікі акампануюць публіцыстам польскай віленскай буржуазнай прэсы ў раструбленьні брэдняў аб антыдзяржаўнай дзеяльнасьці Т-ва, каб супольна з гэтай буржуазіяй зьліквідаваць культурна-асьветную арганізацыю беларускіх працоўных гушчаў, ці падпарадкаваць гэтую інстытуцыю для сваіх мэтаў.

Надыходзячы зьезд Т-ва Беларускай Школы ня можа прайсьці бяз сьледу сярод беларускіх працоўных гушчаў, бо самае існаваньне гэтай арганізацыі, пасіленьне яе дзеяльнасьці шляхам масавага нацыянальна-культурнага ўсьведамленьня—залежыць у першую чаргу ад актыўнасьці саміх гушчаў. Т-ва Беларускай Школы была і ёсьць арганізацыяй, якая сабрала пад свой сьцяг тысячы беларускіх сялян і работнікаў, якія бачаць у ей арганізаваную магчымасьць дабіцца школы ў роднай мове. Гэтым самым скліканы на 21 кастрычніка г. г. зьезд Т-ва Беларускай Школы мусіць быць зьездам, які будзе выражаць жаданьні і імкненьні беларускіх сялян і работнікаў, уваходзячых у Т-ва, выражаць іх балячкі і нязломную станоўчасьць у абароне далейшага існаваньня Т-ва. З гэтаю мэтаю зьезд мусіць быць прадстаўлены масава ў, магчыма, найбольшым ліку, каб разам тут, на зьезьдзе, ваяваць за культуру ў роднай мове, за ваша Т-ва Беларускай Школы. Ад масавага прыезду і ад станоўчасьці ў адпоры наступу буржуазіі і беларускіх здраднікаў залежыць быцьцё і існаваньне Т-ва Беларускае Школы!

Працаўнікі Беларускіх Установ!

Ці зрабілі Вы пастанову аб тым, каб вылічаць пэўны процант ад вашага месячнага заробку на „Дом Беларускае Культуры ў Вільні“? Калі не, то ведайце, што ўжо найвышэйшы час зрабіць такую пастанову.

Лічба 17 — гэта нумар конта (рахунак) „Дому Беларускае Культуры ў Вільні“ ў Беларускім Каапэратыўным Банку ў Вільні. Ці наслалі Вы хоць што-небудзь на гэтае конта? Ці выпаўнілі свой грамадзкі абавязак? Калі не, то зараз-жа пашліце, грамадзянін.

Помніце, што Белар. Навуковае Т-ва ў Вільні пачало зьбіраць ахвяры на пабудову „Дому Беларускае Культуры ў Вільні“. Памятайце, што кожны беларус мусіць ахвяраваць што-небудзь на гэтую сьвятую справу. Ахвяры скіроўваць на адрас: Wilno, ul. Wileńska № 8. Białoruski Kooperacyjny Bank, konto № 17.

Урад Навуковага Таварыства.

Мірна-разбраенчая праца Лігі Нацыяў.

Праца „камісіі разбраеньня“ пры Лізе Нацыяў найлепш паказвае ўсю нашчыраесьць саюзьніцкіх дзяржаў, якія—за ўсялякую цану хочуць утрымаць надалей, — на неабмяжаваны час—усе тыя прывілеі ды перавагу сілы і збраеньняў, якія здабылі яны над разброенай Нямеччынай і яе васаламі—у рэзультаце перамогі. Дзеля таго дыскусія ў „разбраенчай камісіі“ Лігі была асабліва гарачай. Становішча нямецкага дэлегата, які спакойна паўтараў свае нязьбітыя даводы — патрэбы, слушнасьці, справядлівасьці ды карысьці толькі агульнага ды прапарцыянальнага разбраеньня, указваючы на ўсе небясьпекі ўсялякага іншага вырашэньня задачы, спатыкаліся з тым вялікшым абурэньнем з боку азброеных дзяржаваў, чым слушнейшыя былі яго даводы... Запраўды-ж—трэба прыслухацца добра да аргумэнтаў і закідаў дэлегатаў азброеных дзяржаваў проці пазіцыі нямецкай дэлегацыі. Немцы трэбавалі чым-хутчэйшага скліканьня міжнародавай канфэрэнцыі ў справе разбраеньня. Азброеныя дзяржавы—наадварот — хочуць зацягнуць справу гэтай канфэрэнцыі чым надалей. Дык вы думаеце, што гэта яны, гэтыя азброеныя да зубоў дзяржавы, камандуючыя дагэтуль толькі дзякуючы гэтаму ў Эўропе дый дыктуючыя ўсьцяж сваю волю разброенай Нямеччыне, што гэта яны хочуць „скампраміатаваць справу разбраеньня“?..

Не! Гэта — Нямеччына, гэта яе дэлегацыя мае мэтай, — справакаваўшы залішне хуткае (3—4 гады цягнецца справа!!.) скліканьне канфэрэнцыі, не падрыхтаванай добра ў Сакрэтных перагаворах (аб тым, як „умарыць“ фактычнае разбраеньне...),—скампраміатаваць усю разбраенчую працу дзяржаваў“!.. Паслухайце, як піша навет „салідны ды маральны“ орган французскіх „кансэрватараў“—„Журнал дэ-Дэба“.

„Нямецкі манэўр у камісіі мае мэтай „справакаваць (!) за ўсялякую цану... скліканьне міжнародавай канфэрэнцыі дзяржаў—у справе агульнага разбраеньня“ (!). Вось дык — запраўды-ж агідная „правакацыя“!.. Толькі вось існуе ўжо са тры гады спэцыяльная камісія Лігі Нацыяў, якая мае мэтай і задачай чамусьці акурат гэткую-ж—„правакацыйную“ працу!—„Падрыхтаваньня скліканьня міжнародавай канфэрэнцыі ў справе агульнага разбраеньня!.. Але—слухайце далей, як „разумее“ шляхотная газэта французскіх „мілітар-пацыфістаў“.

„Дзеля таго, што згары ведама, што гэта канфэрэнцыя ня дасьць мяккіх рэзультатаў (!), дык якраз таму нямецкі ўрад асабліва націскае на яе скліканьні, каб—у разе—поўнага(!) яе нецасьпеху заявіць голасна на ўвесь сьвет,—аб банкруцтве ўсіх абяцаньняў саюзьніцкіх дзяржаваў у галіне разбраеньня. А тады ўжо нямецкі ўрад зробіць з усяго гэтага вывад—аб тым, што Нямеччына здабыла сабе маральнае права поўнай свабоды ў галіне збраеньняў, — такой самай, якую маюць усе іншыя дзяржавы!!!

Дык газэта радзіць Камісіі, каб тая — „не паддалася правакацыі з боку Нямеччыны дый спараліжавала тонкую ігру нямецкай сацыялістычнай дэлегацыі ў Лізе“...

З гэтага—ясна, якая гарачая дыскусія павінна была разгарэцца навакол, здавалася-б такога навет нявіннага пытаньня, як тэрмін скліканьня гэтай „Падрыхтаваўчай“ Міжнар. Разбраенчай Канфэрэнцыі. Камісія двойчы адсылала праект рэзалюцыі ў справе скліканьня „Падрыхтав. Камісіі“ ў рэдакцыйны камітэт. Урэшце, дзякуючы стылістычнай лоўкасьці французскага „ўрадавага сацыяліста“ Бонкура, удалося ўлажыць праект рэзалюцыі, які для нямецкай дэлегацыі аказаўся настолькі „магчымым“, што яна, каб ён мог быць прынятым „аднагалосна“ камісіяй, устрымалася ад галасаваньня, заявіўшы, што — тое самае зробіць і на паседжаньні Агульнага Збору Лігі, які мае канчальны голас у гэтай справе.

Рэзалюцыя кажа, аб тым, што „Падрыхтаваўчая Камісія“ мае абавязкова сабрацца ў першай чэцьверці 1929 г. (не пазьней, як у сакавіку); тэрмін скліканьня Міжнар. Канфэр. у справе разбраеньня накінуты меркаваньням старшыні камісіі, які павінен у гэтай справе паразумецца з урадамі паасобных дзяржаваў, ды прыняць пад увагу агульны стан працаў Лігі ў галіне ўмацаваньня бясьпечнасьці. Уступная частка рэзалюцыі кажа, што — „абмяжаваньне збраеньняў павінна залежыць ад стану варункаў бясьпечнасьці дзяржаваў; што—дзяржавы, якія прызнаюць стан сваей бясьпечнасьці нявыстарчаюча загарантаваным, маюць магчымасьць умацаваньня яго — шляхом працаў „камісіі бясьпечнасьць і арбітражу“, пастановы якой могуць быць праведзены ў жыцьцё пры помачы Рады Лігі Нацыяў“...

Вось гэты ўвесь уступ нямецкая дэлегацыя і трэбавала цалком выкінуць з рэзалюцыі, як — ня маючы беспасрэдняй сувязі з справай, а перадусім—як адкладаючы тэрмін скліканьня разбраенчай канфэрэнцыі на не абмяжаваны час.—Запраўды-ж—паводле рэзалюцыі—разбраенчая праца Лігі будзе залежыць ад любой дзяржавы, якая проста заявіць, што „яе варункі бясьпечнасьці загарантаваны яшчэ нявыстарчаюча“ і—канец! Наагул, рэзалюцыя стаіць на груньце ведамай „французскай“ формулы ці тэзы ў справе разбраеньня: „сьпярша бясьпечнасьць, а пасьля разбраеньне“, вельмі прыпамінаючай слаўную формулу Сталыпіна: „сьпярша супакоеньне, а пасьля рэформы“...

Нямецкая дэлегацыя стаіць на якраз адваротным становішчы, лічучы, што адным з галоўных варункаў агульнай бясьпечнасьці і міру зьяўляецца чым больш агульнае разбраеньне дзяржаваў. Чым менш збраеньняў—гарматаў, кулямётаў, гранатаў і ўсялякага іншага ваеннага матарыялу нагуртавана ў сьвеце, тым менш небясьпекі вайны. А ў кожным разе—тым менш крывавая ды руйнуючая будзе вайна, калі яна навет неяк выбухне. Гэта-ж—бясспрэчна для ўсякага здаровага розуму. На гэтым становішчы стаяла зусім яшчэ нядаўна ў Лізе і Англія. Але цяпер — асабліва-ж ад часу новага паразуменьня з Францыяй—англійскі ўрад цалком прыняў становішча Францыі ў гэтай справе, не жадаючы—за французскія ўступкі англійскаму панаваньню на моры,—перашкаджаць французскаму панаваньню на эўрапэйскім матэрыку.

Такім чынам Ліга Нацыяў паставіла на першым пляне працу ўмацаваньня бясьпечнасьці ў Эўропе, узалежніўшы ад гэтай неабмяжавана доўгай працы — абмяжаваньне збраеньняў!..

---

25 верасьня ўся справа перайшла на форум Агульнага Збору Лігі. Маем аб гэтай дыскусіі пакуль што толькі кароткія тэлеграфныя весткі.

Пасьля дакладу старшыні камісіі мін. Бэнэша першы забраў голас дэлегат Вэнгрыі, аднэй з найбольш пакрыўджаных пераможцамі дзяржаваў, і коротка заявіў, што — Вэнгрыя ня можа згадзіцца з такім павольным тэмпам разбраенчай працы Лігі, а таму — ня можа галасаваць за рэзалюцыю камісіі.

Пасьля—у даўжэйшай, дэтальна матываванай прамове—выклажыў пагляд і становішча Нямеччыны гр. Бэрнсторф. Пазываючыся на першую прамову ў Лізе канцлера Мюллера, які трэбаваў найхутчэйшага скліканьня Разбраенчай Канфэрэнцыі, нямецкі дэлегат заявіў, што яго дэлегацыя надалей цьвёрда стаіць на гэтым дамаганьні, а дзеля гэтага ня будзе галасаваць за рэзалюцыю, якая адкладае гэтую Канфэрэнцыю на неабмяжаваны час. Не жадаючы аднак-жа вырачыся надзеі на тое, што нешта зробіць у гэтай справе „Падрыхтаваўчая камісія“, скліканьне якой удалося забясьпечыць у азначаным часе, нямецкая дэлегацыя — не галасуе проці, але—стрымліваецца ад падачы голасу.

Каб аслабіць ураженьне ад забіўчай прамовы „былога нямецкага мілітарыста гр. Бэрнсторфа“, які „вучыў саюзьніцкія дзяржавы пацыфізму“, выступіў Поль Бонкур, ведамы сваім красамоўствам—амаль не раўнуючымся Брыянаваму.

Французскі дэлегат пацяшаў Лігу, што—няма ніякай прычыны для расчараваньня ў сіле і „добрай“ волі Лігі ў напрамку разбраеньня, наадварот. Толькі вось—праца гэтая—вельмі цяжкая дый павольная, а гэта—зусім натуральна. Ліга зрабіла ўжо шмат на шляху да разбраеньня (нияк аб гэтых „выніках нешта ня чуваць...). Але, апроч вялікіх перашкодаў тэхнічнай натуры, выступаюць на від і вельмі важныя перашкоды палітычнага характэру... Ліга зарэгістравала дагэтуль шмат трактатаў паміж рознымі дзяржавамі — у справе ўзаемнай бясьпечнасьці і ўстанаўленьня палюбоўных судоў, — а гэта ўсё—значна пасунула ўперад справу разбраеньня“. Трэба толькі асабліва сьцерагчыся якраз залішняга прысьпяшэньня разбраенчай канфэрэнцыі, бо гэта магло-б найбольш пашкодзіць (?) ажыцьцяўленьню шляхотнай (!!.) ідэі разбраеньня“...

Але трэба таксама згары здаць сабе справу, што — Першая Разбраенчая Канфэрэнцыя напэўна-ж не давядзе да новага зьменшаньня збраеньняў (а пэўне-ж!!!), а можа, толькі—да ўтрыманьня іх на існуючым цяпер роўні (толькі ня роўнасьці!), гэта значыць—ухіліць толькі небясьпеку далейшых выперадкаў у збраеньнях... Але і гэта было-б вялікай перамогай. Далей, французскі дэлегат і аўтар рэзалюцыі зьвярнуўся ад імя камісіі да ўсіх дзяржаваў, асабліва—марскіх, каб яны чым хутчэй дайшлі да паразуменьня ў справе абмяжаваньня збраеньняў на моры, без якога ня можна навет думаць аб скліканьні Разбраенчай Канфэрэнцыі“...

Але, як ведама, паміж гэтымі вялікімі марскімі дзяржавамі толькі што разгараецца на добра—якраз у справе збраеньняў,—спорка, у якой у пяршыню прымае ўчасьце і магутная Амэрыка... Красамоўны Поль Бонкур дапускае, аднак-жа, што першая канфэрэнцыя, арганізаваная Лігай, не давядзе і да гэтага сціплага рэзультату. Але і пасьля гэткага банкруцтва—„Ліга будзе працаваць надалей, але ўжо—падобная да божства, якому з галавы сарвалі карону“...

Наскалькі сільная была прамова нямецкага дэлегата, відаць з галасоў французскай прэсы. Ваяўнічае „Рэха Парыжу“ піша аб такой—скандальнай „недарэчнасьці, каб ваяўнічы абаронца падводнай вайны, як гр. Бэрнсторф, даваў урокі пацыфізма саюзьнікам“... Газэта „Матэн“ (Раньніца) піша, што—„не прайшло яшчэ 10 гадоў пасьля сканчаньня вайны, а Нямеччына ўжо выступае ў ролі сьледчага судзьдзі, разглядаючага збраеньні саюзьнікаў дый ставячага ім ультыматум у галіне бясьпечнасьці“...

„Журналь піша, што — у выніку трыдняўных бясплодных спорак у камісіі разбраеньня—справа міру, дзякуючы Нямеччыне, значна пасунулася... назад“, што „закончаньне сэсіі Лігі Нацыяў адбылося пад уражаньнем яўнага расчараваньня“... Ці дзякуючы Нямеччыне ці каму іншаму, але — што „пасунулася назад“, гэта вельмі падобна да працы...

Трактат Кэллёга і небясьпека вайны.

Неўгамонны імпэрыялізм цэлае зямное кулі збройцца ад галавы да ног.

Калі прыглядзімся да штодзенных фактаў, то для нас стане ясным, што ўзрост хімічнага промыслу, прадукцыі ваенных вырабаў (танкі, амуніцыя і г. д.), узрост марскіх узбраеньняў, як пабольшаньне колькасьці ваенных караблёў, ваенные флёты, будова новых браняносцаў, узрост прадукцыі ўдушлівых газаў і іншых прыладаў сьмерці, пабольшаньне ваенных бюджэтаў у-ва ўсіх капіталістычных дзяржавах і сталыя ваенныя нарады паміж рознымі міністрамі і ваеннымі штабамі—усе гэтыя факты зьяўляюцца яскравым выразам гарачае ваеннае падгатоўкі з боку сучаснага капіталістычнага сьвету.

Для таго, каб затуманіць масам вочы перад пагрозаю вайны, буржуазія склікае розныя „мірныя“ зьезды, якія, запраўды, ёсьць нічым іншым, як зьездамі падгатоўкі вайны і падпісваньня розных „анты“-ваенных трактаў.

Адным з такіх трактатаў, аб якім пісаў і гутарыў цэлы сьвет у апошнім часе—ёсьць трактат Кэллёга.

Ці запраўды трактат Кэллёга кладзе крэс усялякім войнам? На гэтае пытаньне могуць адказаць вышэйсказаныя намі факты гарачых збраеньняў з боку ўсіх капіталістычных дзяржаваў; на гэта адказвае нядаўна падпісаны дагавор марскіх збраеньняў паміж Англіяй і Францыяй; на гэта адказваюць і іншыя факты, аб якіх (па цэнзурных умовах) мы пакуль што памаўчым і, ўрэшце, на гэта адказвае хоць-бы і той факт, што сам закладчык „антываеннага“ трактату—Кэллёг, па прыезьдзе ў Амэрыку прыказаў збудаваць два новыя браняносцы, якія, напэўна, ня служаць прыладамі для забясьпечаньня яго залатога пяра.

Усе гэтыя пацыфістычныя трактаты і зьезды маюць адно заданьне — усыпіць чуткасьць працоўных масаў.

Гэтую праўду скрываюць перад працоўнымі масамі толькі буржуазійныя пацыфісты і „абаронцы“ працоўных з-пад сьцягу II-га Інтэрнацыяналу.

Нядаўна адбыўся кангрэс II-га Інтэрнацыяналу, якім кіравалі такія выдатныя прадстаўнікі капіталістычнага сьвету, якія сядзяць у розных буржуазных габінэтах і ў Лізе Народаў, як Ванкоур, Рандэррэльдэ, Шайдэман і нашыя. Кангрэс гэты, які ў груньце рэчы зьяўляецца другім накладам Лігі Народаў, гэтай інстытуцыі скрытых ваенных падгатовак, нічога іншага не пастанавіў, а толькі сьпяваў пахвальныя гімны трактату Кэллёга і Лігі Народаў, хочучы, такім чынам скрыць перад працоўнымі масамі небясьпеку новай вайны. Але ў той самы час, калі трубы буржуазіі і іх служкаў абвяшчаюць па цэлым сьвеце, што настаў час вечнага міру, што ня будзе больш вайны, ня будзе ліцца кроў — у гэты самы час сацыял-дэмакратычныя міністры ў Нямеччыне галасуюць разам з буржуазіяй за тое, каб будаваць новы браняносец. А, кажучы такім чынам, што пасьля А, наступае яшчэ дваццаць сем літараў да Я і такім чынам разам з буржуазіяй нямецкай збраяцца з галавы да ног і іншыя „апякуны“ міру.

І гэтыя факты сьведчаць аб тым, чаго варты пацыфістычныя словы буржуазіі і іх служкаў, калі ў Нямеччыне разам з буржуазіяй збраяцца і радзімыя „сацыялісты“.

Справа будовы новага браняносца пры помачы нямецкіх сацыял-дэмакратаў сталася ў сучасны момант цэнтральным пытаньнем нямецкага пралетарыяту, пераважна той часткі, каторая знаходзіцца пад уплывам сацыял-дэмакратаў. Гэтая частка нямецкага пралетарыяту атрымала яшчэ адзін найбольш яскравы доказ, што правадыры С.-Д.—зьяўляюцца складовай часткай нямецкай буржуазіі і што верна выконваюць іх прыказы і даручэньні.

Бура пратэстаў унутры самой нямецкай С.-Д. адкрывае гэтую праўду, не даючы скрыцца перад масамі.

Тое, што адбываецца ў Нямеччыне, адбываецца штодзенна і ў іншых дзяржавах, дзе сацыял-угода з II-га Інтэрнацыяналу дапамагаюць на кожным кроку буржуазіі ў пазбаўленьні правоў працоўных масаў места і вёскі.

Але гэтыя апазіцыйныя галасы з боку розных сацыял-правадыроў, — гэта ашуканчы манэўр, яны паказваюць на гэты факт, як на адзіны праяў, скрываючы перад масамі, што гэта ёсьць сыстэма палітыкі С.-Д., якая вырасла ў цэлы імпэрыялістычны апарат паасобных дзяржаваў і што кожная партыя С.-Д. зьяўляецца выразам свае радзімае буржуазіі.

Але ані сацыял-угода, ані буржуазія і іх верныя служкі ня здолеюць скрыць перад сялянска-работніцкай моладзьдзю пагрозы новай імпэрыялістычнай вайны, бо моладзь сама перажывае і адчувае гэта і ня дасцца сябе абаламуціць.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

І сялянства пачынае змагацца з панскім вызыскам.

277 нумар „Rzeczy-plitej“ інфармуе аб наступным факце:

У маёнтку Дэмбы каля Крулеўскай Любычы выбухла забастоўка зямельных работнікаў. Прычына забастоўкі—адмова гаспадара маёнтку працы сэзонавым (падзённым) работнікам.

Бастуючыя ня йшлі да працы 10 дзён і не дапускалі да гэтага іншых.

Тады „дзедзіц“ прывёз падзённых работнікаў з іншага (яраслаўскага) павету. Тутэйшае жыхарства папераджала прывезеных, каб яны ня йшлі працаваць. Калі-ж прыбыўшыя не паслухалі і пашлі ў поле, тады прышоў натаўп мясцовага жыхарства (больш 150 чалавек), пераважна жанчын, і прагнаў іх каменьнем з поля.

Дамаганьні работнікаў Сьпіртавай Манапольні

Праф. саюз работнікаў спажывецкага прамыслу выслаў у свой час да Дырэкцыі Сьпіртавай Манапольні цэлы рад эканамічных дамаганьняў, як 40 прац. даплаты за хваробы, выплаты пэнсіі на выпадак забраньня работнікаў на вайсковыя абучэньні, 13 платнай пэнсіі ў 3 ратах і г. д.

Надовячы, з гэтага поваду, у Дырэкцыі адбылася канфэрэнцыя ўсіх праф. саюзаў, працуючых у абшарах Сьпіртавай Манапольні. На работніцкія дамаганьні Дырэкцыя запрапанавала даплату 50 грошоў на дзіця, для абцяжаных сям'ёй, зьвярненьне кошту навучаньня дзяцей і ступнёвае зраўнаньне платы раб. сьпіртавай манапольні з платай раб. тытунёвай манапольні. Апрача гэтага, Дырэкцыя запрапанавала 10 дзённую дапамогу платную ў лістападзе на зімовыя закупкі.

Прадстаўнікі праф. саюзаў на такую прапазіцыю не згадзіліся і падтрымліваюць свае папярэднія дамаганьні.

Як бачым, дык работнікі ў Польшчы ўпорна змагаюцца за належнае палепшаньне свайго становішча — за належную плату за сваю працу—і змагаюцца да канца г. з. да перамогі.

„Дзіўная прэтэнзыя“.

Пад такім загалоўкам 223 № „Słowa“ паведамляе аб дамаганьні праф. саюзам „Праца“ поўнай заплаты работнікам валакнянага прамыслу за дні забастоўкі, з прычыны вывешаньня табліцы караў.

Яшчэ забастоўка.

У фабрыцы мэблі „Мазовія“ ў Радомску пачалася работніцкая забастоўка.

Бастуючыя (300 чалавек) жадаюць 15 прац. падбаўкі платы.

Работа жыдоўскіх камуністаў у Львове.

Львоўская прэса падае аб наступным выпадку ў Львове, які прыпісвае жыдоўскім камуністам.

Справа ў тым, што ў часе жыдоўскіх ўрачыстых сьвят (кучак?) на сьценах Львова зьявіліся афішы (ў жыдоўскай мове) з выразна антырэлігійным зьместам, заклікаючым жыдоў не пасьціць і не маліцца.

Даведаўшыся аб гэтым, паліцыя выслала рад выведоўцаў з загадам зьдзіраць афішы. На Замарстынаўскай вуліцы ў абароне афішаў сталі 2 маладыя жыдкі. Паліцыянт іх арыштаваў. У адзін міг сабраўся натаўп, маніўшыся адабраць арыштаваных. Паліцыянт пачаў пагражаць рэвальвэрам і толькі дзякуючы гэтаму давёў арыштаваных да блізкага будынку вайсковай жандармэрыі. У сувязі з гэтым, канчае прэса, зроблены цэлы рад рэвізіяў і арыштаў сярод львоўскіх камуністаў.

Ці камуністы, ці некамуністы друкавалі гэтыя „процірэлігійныя“ афішы—ня так важна, а важна тут тое, што цяперашняе пакаленьне (моладзь) ужо не такое, як даўнейшае,—яно да сярэднявечча вяртацца ня хоча і розныя пасты, і іншыя атрыбуты рэлігіі лічыць плашчыкам капіталізму.

„Збродзічы“ замах на чыгунку.

Надовяшняй ноччу на 13 кілёмэтры чыгуначнага шляху ад Львова няведамыя спраўцы раскапалі шлях (шырынёй аж 2 мэтры) і падлажылі пад яго выбуховы матэр'ял. Да ўзрыву шляху ня дайшло — якраз нагадзіўся чыгуначны сторож і спудзіў замахоўцаў, якія ўцякаючы далі ў яго некалькі рэвальвэравых стрэлаў. Сьледства йдзе.

Вялізарная пабаровая „афэра“.

Апошнімі часамі ў Польшчы вельмі часта спатыкаюцца розныя „надужыцьці“, „дэфраўдацыі“ і „афэры“.

Вось і цяпер прэса падае аб нядаўна выкрытай вялізарнай пабаровай афэры ў Саноку, практыкаванай ужо даўно. Да гэтага часу арыштавана 19 чалавек, разам з адным вайсковым доктарам. Падрабязнасьці трымаюцца ў найвялікшым сэкрэце.

Уцечка літэратара.

У мінулым тыдні акружны суд ў Лодзі меўся разглядаць справу польскага публіцыста і літэратара Вітольда Вандурскага, абвінавачванага ў „вывратовай“ дзейнасьці і камуністычнай агітацыі ў часе выбараў.

Гэтая справа, натуральна, выклікала вялікае заінтэрасаваньне, бо Вандурскі быў досыць відом, а асабліва ў Лодзі. Вандурскі меўся адказваць з „вольнай рукі“ і прыехаць на суд з Варшавы. Пасьля некалькіх гадзін чаканьня, судзьдзя пастанавіў адлажыць суд і загадаў арыштаваць падсуднага, аднак гэта, як інфармуе прэса, было непатрэбным, бо Вандурскі ўцёк ў Гданск, дзе карыстаецца правам азылю (не выдаваньня заграічных палітвязьняў).

Крыху аб самагубствах.

Згодна з статыстычнымі інфармацыямі самагубстваў у Варшаве, у жніўні г. году было 103 самых замахаў, з якіх 22 кончыліся сьмерцьцю на мейсцы. Прычыны самагубстваў падаюцца эканамічныя.

Гэта ў адной толькі Варшаве і за адзін месяц столькі ахвяраў несправядлівага распрадзяленьня працы і сродкаў жыцьця на зямлі—з прычыным, што адны (капіталісты) маюць вельмі многа, а другія, якіх страшэнная большасьць-працоўныя —ня маюць нічога,—ня маюць навет працы, за якую атрымалі-б хоць паўгалоднае пражыцьцё.

А па-за Варшавай — у іншых горадох Польшчы, а па-за Польшчай,—ува ўсім капіталістычным сьвеце, — ці-ж мала працоўных канчае самагубствам, прадбачачы галодную сьмерць?—Калі аб гэтым падумаеш, дык бачым такіх самагубцаў цэлыя мільёны і то ў адзін месяц!

Ці-ж гэта ня вельмі яркі прыклад капіталістычнай справядлівасьці?

Заграніцай.

Адказ Амэрыкі на ноту аб англа-францускім паразуменьні ў марскіх збраеньнях.

Амэрыканскі ўрад урэшце пераслаў урадам Англіі і Францыі свой адказ на ноту ў справе „англа-францускага паразуменьня на моры“. Амэрыканская нота, як даведалася англійскае тэлегр. агенства, адкідае рашуча прапазіцыю—распачаць перагаворы ў справе абмежаваньня марскіх збраеньняў—на падставе „англа-францускага кампрамісу“.

Амэрыканская прэса, з свайго боку, зьмяшчае амаль не цалком адказ амэрыканскага ўраду на англа-францускае „тайнае паразуменьне“. Амэрыка трэбуе, каб уся справа абмежаваньня марскіх збраеньняў была разгледжана на спэцыяльнай канфэрэнцыі — з удзелам усіх марскіх дзяржаваў — у-ва ўсім абыйме гэтага важнага пытаньня—ясна і адкрыта,—не карыстаючыся „спосабамі тайнай дыпляматыі“ дый „сэкрэтных сэпаратных умоваў“. З гэтага ясна, што Амэрыка папросту ня прымае навет да ведама перасланага ёй тэксту (?) англа-францускага трактату, які лічыць проста —„ня існуючым“...

Ці-ж можна сумлявацца, што пасьля

Як паны павесілі сялянскую кабылу.

Факт падобны да байкі.

(Фэльетон).

(Браслаўшчына).

Прачытаўшы загаловак, мусіць, вельмі чытачы, зьдзівецеся—як-жа гэта маглі павесіць кабылу? — Скарэй паверылі-б, каб напісаў, што селяніна якога падстрэлілі, застрэлілі, набілі, у суд падалі і г. д. Падумаеце—брэша, не дасьце веры. Аднак праўда, браткі, далібог праўда—павесілі!

Укажу Вам навет і мейсца, дзе такі выпадак здарыўся.

Гэтая асаблівая, і дасюль яшчэ ня чуваная, экзэкуцыя адбылася на днях у маёнтку Вяльмо (не на воку, а проці неба на зямлі) Браслаўскай гміны.

Пана я ў гэтым ня надта віную, бо-ж, бачыце, тая жывёлінка-кабылка гэтага была і варта — заслужыла на такую ганебную сьмертухну. Так ёй і трэба — хай ня лезе на панскую сенажаць! Адпрог яе, бачыце, гаспадар — М. Пальчэўскі і пусьціў, ня спутаўшы, на поле папасьвіцца. Кабылка ад цёмнага працавала—галодная. Хадзіла, хадзіла па сялянскай талоцы—нічога няма, ляскае толькі зубамі напрасна, а ў зуб і нечага і, як на той грэх, падыйшла да панскай граніцы.

Відзіць, за тым баку атаўка зялёная, вялікая. Пацякла сьліна ў яе, спакусілася, падла і — скок, праз роў на панскае поле. (Калючым дротам загароджана ня было). Скубе траву, аж саніць кабыла! Як на тую гібель — нашчасьце, у гэты час абходзіў поле пан упраўляючы Гіра. Прозьвішча яго, як бачыце, тутэйшае, папольску было-б Цэнжар, але... вядома спалячэўшы выпадак — на-тутэйшаму ані зюк!

Кажуць, што былы шляхцюк, але прапіў свой фальварак, заматаўся ў даўгі, дык цяпер і адслужвае адзін з іх ў тутэйшай б. графіні. Нялоўка было „шляхотнага“ чалавека садзіць у вастрог, дык, знача, далі яму „працу“. Хоць і за доўг, але працуе, падла, шчыра, лепш як другі за жывыя грошыкі.

Дык, знача, убачаў гэты самы пан Гіра кабылку на панскім полі і аж зубамі заскрыгатаў са злосьці.

— А, пся крэў! Ложкі дратаваць!

Я табе накажу дзе ракі зімуюць! — Бяжыць, вочы вылупіўшы — як схопіць кабылу за грыву, але тая ня дурак паддавацца. Адляціцца ад пана і ізноў скубе траву. Лётаў, лётаў за ёй ззаду п. Гіра, ажна лоб мокры стаў, засапаўся, як кавалёў мех, а кабылы ня можна злавіць, хоць ты лопні!

— Чэкай холера, я табе не дарую! Папёрся ў м. па вяроўку—надумаў пятлёй злавіць. Ен у гэтым спэцыялісты, бо-ж, бачыце, яго дзед служыў калісь у нейкага там Радзівіла сабакаром і надта спрытна ўмеў лавіць „жывёлу“ на пятлю, а гэта здольнасьць, так сказаць, спадчына перайшла і да ўнучка.

Махнуў пан раз — не папаў, другі прамахнуўся, а за трэцім такі якраз пятля на шыю лучыла.—Дзякуй богу! Я-ж табе, хамская ты народа, пакажу, як у панскія пожні лазіць!

Адсьцябаў бізуном і цягне за вяроўку ў хлеў. Кабылка баіцца, упіраецца, але нічога не парадзіш: гэтакі вол цягне ўпёршыся, палажыўшы вяроўку цераз плячо, душыць за горла — нехаця мусіць йсьці. Прывёў, прывязаў за вялікі такі гак, замальдаваў надупраўляючаму (ёсьць і гэтакі) аб гэтай „здабычы“ і пайшоў ізноў на „паляваньне“.

Стаіць кабылка, назірае на панскія аборы, аблізваецца пасьля такой смачнай закускі. І нічога, мусіць, дрэннага ня было-б здарыўшыся, каб няпёгкая не ўзгнала паноў. Так была-б і стаяўшы спакойна кабылка.

Як на тую бяду, відзіць яна, што ідзе за падручку пара:—ён—высокі, даўганосы з бізуном у руцэ, яна—у капялюшу, на руках белыя пальчаткі, хакочаць, круціцца, пазірае даўганосаму ў вочы.

— Добрыя, мусіць людзі—думае кабылка. Зайшлі ў абору, ды як закрычэлі там, ажна кабылка затраслася ад страху.

Выскачыў адтуль парабак, чырвоны, як рак і чагось маланкай паляцеў праз дзядзінец.

— Вось табе — думае кабыла — і добрыя! — Са страху яна і ў той бок баялася глядзець, дык і не заўважыла, што там было далей. Чуе толькі падыходзяць да яе.

— Цо то за шкапа? — пытае пані.

— То хлопска, забрана з лонкі — тлумачыць даўганосы.

— Не даён жыця, не даён жыця тэ хлопы! І поцо оні жыён на сьвеце тэ быдлякі! Тыльно шкоду робяць добрым людзям! — лемантавала пані, а даўгавязы, як урэжа са злосьці палавіком па кабыле, аж у той рубец падняўся ўдоўжкі рэбраў. Рванулася, бедная, ня можа ўцячы — душыць за горла. Толькі адыйшлася гэта пара, сыпе нейкі стары сівы і таксама з бізуном у руцэ. Стаў сярод падворка, ды як крыкне: —

— Служба, до мне! —

Выскачылі з усіх кутоў сутулыя, абадраныя людзікі і сталі ў-ва фронт. Стаяць і вокам ня міргнуць! А сівы расхаджвае перад імі ды ўсё нешта бае, махаючы бізуном, то аднаму, то другому над нос, нераўнуючы, як царскі палкоўнік даўней. Пасьля скамандаваў ім штось і яны хто куды — бягом да працы!

— Строгі чорт—думае кабыла — гыркае на людзей, каб на яго сто ваўкоў гыркала!

Аглядаецца, баіцца, каб чаго добрага, не падыйшоў гэты сівы да яе.

Аж так і ёсьць, відзіць — ідзе! Агарнуў яе страх, забылася і пра пятлю на шыі, як рванулася ўцякаць з усіх чатырох, аж вяроўка ўелася ў горла.

Пацямнела кабыле ў вачох, брынк, аб зямлю і завесілася на круку. Вядома, у маёнтку вяроўкі новыя, моцныя, дык і ня лопнула — вісіць кабыла.

Сівы ў гвалт, крычыць, заве на ратунак работнікаў, але тыя, думаючы, што падганяе да працы, ня туды таго — ня йдуць.

Пакуль тое-сёе, дык кабыле і душ... (перапрашаю) і дух вон.

Што рабіць? паслаў стары за п. Гірай— хай — кажа — і зьнімае, калі павесіў! —

Прыляцеў Гіра, сазваў работнікаў, тузаюць кабылу, тузаюць, а зьняць з крука ня могуць. Так і прышлося папсаваць—перарэзаць вяроўку.

Прыказаў упраўляючы людзям маўчаць аб гэтым і скарэй папёрлі падлу ў бор, — закапалі і сьляды зацёрлі.

Шукаў, шукаў Пальчэўскі сваёй кабылы і туды, і сюды, і сваё і панскае поле аблётаў—няма. Пытае ў людзей: ці ня відзелі.

— Пацягнуў — кажуць—пан у двор.—

Ён да пана. — Даруй панок на гэты раз — аддай кабылу!

— Няма — кажа — была, але адарвалася і ўцякла да вёскі. —

Пайшоў, бядак, ізноў шукаць ветра ў полі і, мусіць, доўга шукаўбы, але, дай бог здароў'я, пашкадаваў яго адзін парабак.

Павесілі тваю кабылу — кажа. — У бары знойдзеш! —

Селянін багаты на дзяцей (7 душ), а зямлі ўсяго дзьве дзесяціны мае.

— Прапаў цяпер без каня! — думае. Заплакаў й ідзе да ўпраўляючага.

— Панок, кажуць, вы маю кабылку павесілі! Як-жа цяпер будзе? —

— А цо будзе! Халера! Трэба было ня пушчаць на панскае! Калі хочаш, дам 70 залатовак! —

— А што-ж я за іх куплю, авечку? Яна ж чатырыста была варта! —

— Як ня хочаш, то ідзь до д'ябла! Ніц не дам — судзіся сабе! —

Заявіў Пальчэўскі на пастарунак і пакуль суд—справа, а яму, бедаку, цягай сьнапы на карку — няма на кім працаваць.

Кажуць, што паны вядуць цяпер сьледзтва, каб выкрыць таго, які здрадзіў таямніцу і зьбіраюцца яго цяжка пакараць.

Апавядаюць, што ахрэмаўскія коні, пасьля гэтага павешаньня, страшэнна сталі баяцца паноў. Як заўважаць каторага, дык за паўвярсты ўцякаюць, зьбіраюцца ў грам... (перапрашаю: гэтак ня можна называць) у табун, дзяруць капытамі зямлю, ржуць, быццам пачуўшы стада ваўкоў.

Калі ня верыце мне, дык запытайце сабе ў Ахрэмаўскіх суседзяў Пальчэўскага, тыя пасьведчаць, што гэта праўда.

Янка-Пятрок.

гэтага Чэмбэрлен паляціць з станові́шча міністра заграні́чных спраў, атрымаўшы — за яго „рапальскую“ штучку, мокрай сьціркай па... манокль ад Куліджа!..

Ці Польшча будзе мець голас у справе акупацыі?

Сацыялістычная газэта „Вечар“ (вячорнае выданьне „Форвэртс'а“, чалавага органу нямецкай сацыял-дэмакратычнай партыі, які можа разглядацца цяпер, як афіцыёзны орган, нямецкага канцлера), зьмясьціла вельмі калючыя ўвагі з прычыны няўдалай падарожжы мін. Залескага ў Парыж, каб там націснуць на Брыяна—у кірунку дапушчэньня Польшчы ў „камісію 6-х“, якая мае вырашыць справу перадчаснага скасаваньня акупацыі Надрэніі.

„Дэр Абэнд“ піша: „Залескі ня меў шчасьця ў Парыжу, навет ня быў прыняты Брыянам. Француская газэта „Воля“ высказвае з гэтай прычыны некалькі няпрыемных для Польшчы ўвагаў:

„Польшча мыляецца, калі думае, што Францыя перад кожным сваім крокам павінна пытацца адабрэньня ці дазволу з боку Польшчы. Польшча мыляецца яшчэ больш, калі думае, што Францыя адкіне „палітыку Лёкарно“, гэта значыць—паразуменьне з Нямеччынай, каб толькі ўтрымаць польскую прыязьнь. Польшча мыляецца ў трэці раз, хочучы відзець уласную бясьпечнасьць у ўтрыманьні француского войска ў Надрэніі“.

Прыводзячы гэтыя цытаты з нямецкай газэты, эндэцкая прэса дадае, што ўсё гэта піша орган канцлера Мюллера, які сам вядзе перагаворы з саюзьнікамі ў справе акупацыі, дык пэўне-ж добра інфармаваны ў думках і настроях сваіх контр-агентаў!

Новыя сэнсацыйныя рэвэляцыі аб „польскім замаху на Літву“.

Літоўскае афіцыяльнае агенства падае новыя сэнсацыйныя весткі аб быццам усьцяж рыхтаваным нападзе Польшчы на Літву. Вось, што кажа тэлеграма агенства. „Нядаўна перайшоў з Польшчы ў Літву афіцэр II аддзелу польскага генэральнага штабу, які ў крымінальнай паліцыі ў Коўне даў наступнае паказаньне: „У апошні час II Аддзел Польск. Генэр. Штабу вядзе вялікую працу. Арганізацыя Плечкайціса—пасьля зьезду легіянэраў у Вільні—усіліла сваю дзейнасьць. Нядаўна адбылася канфэрэнцыя паміж Пілсудскім і Плечкайцісам у кватэры князя Радзівілла, у якой прынялі ўчасьце маёр Кіртыкліс, пасол Касьцялкоўскі, сэнатар Абрамовіч, пасол Рачкевіч, маёр ген. штабу Мэйер, палк. Пакош, пасол Акуліч, ген. Сьмігльы, ген. Соснкоўскі і палк. Славэк. На канфэрэнцыі абгаварвалася справа арганізацыі Плечкайціса і яе дзейнасьці ў Літве. На гэтую мэту асыгнавана 10.000 даляраў, якія і былі перададзены Плечкайцісу пасьля зьезду легіяністаў. 14-га жніўня г. г. адбылася канфэрэнцыя між Плечкайцісам і ген. Сьміглым — у мэтах дакладнага падрыхтаваньня стратэгічных апорных пунктаў у Літве. У Вільні арганізаваны літоўскі ўрад, у склад якога ўваходзяць польскія палітычныя дзеячы: маёр Кіртыкліс, пасол Касьцялкоўскі, сэнатар Абрамовіч (Вітальд), пас. Рачкевіч і пас. Акуліч.

У апошні час Плечкайціс запэўняў II Аддз. Ген. Штабу, што да лістападу будуць скончаны ўсе падрыхтаваўчыя працы. У Вільні распачата ўсільная дзейнасьць. У дзяржаўнай друкарні друкуюцца адозвы Плечкайціса—проці літоўскага ўраду, якія—праз Рыгу—перасылаюцца ў Літву.

Афіцыяльнае запярэчаньне з боку польскага ўраду.

Польскае тэлеграф. агенства афіцыяльна заяўляе, што ўсе весткі літоўскага агенства аб пераходзе польскага афіцэра ў Коўну — няпраўда, дык і ўсе гэтыя быццам зробленыя ім рэвэляцыі—цалком выдуманы — у мэтах ашуканьня публічнай апініі.

Англійскія капіталы ў СССР.

Маскоўскі карэспанд. „Кур. Варш.“ даведаўся, быццам радавы ўрад распачаў перагаворы з групай англійскіх капіталістаў, якія маюць атрымаць вялікую канцэсію на разработку лясоў у СССР. Англійскія капіталісты маюць улажыць у гэты інтэрас 3 мільёны фунтаў (15 міл. даляраў).

Амэрыканцы ў СССР.

У кастрычніку мае прыехаць у Маскву група амэрыканскіх прамыслоўцаў, якая распачне перагаворы з радавым урадам—у справе будовы на поўдні СССР 2-х вялікіх фабрыкаў трактараў і самаходаў. Абедзьве фабрыкі маюць заняць больш 20.000 работнікаў. У гэты інтэрас амэрыканскія капіталісты маюць улажыць 40 мільёнаў даляраў.

Як бачым, неўзнаўленьне дыпляматычных стасункаў не перашкаджае ані англійцам, ані амэрыканцам разбудоўваць фактычна гаспадарчыя стасункі з СССР.

Выбарная праграма англійскіх сацыялістаў.

Старшыня англійскай работніцкай „Партыі Працы“ Лэнсбэры заявіў, што найважнейшай задачай кангрэсу партыі ў Бірмінгаме было апрацаваньне плятформы (праграмы) Партыі — на наблі́жаючыхся выбарах у парлямант. Праграма азначана так: сацыялізацыя прадпрыемстваў, усталеньне мінімуму (найменшага разьмеру, ніжэй якога яна ня можа быць) работніцкай платы, барацьба з безрабоцьцем, нацыяналізацыя капальняў вугальля. Усе гэтыя галоўныя пункты выбарнай плятформы прыняты кангрэсам аднагалосна. Апрача таго, партыя будзе трэбаваць, каб школьны прымус для дзяцей быў прадоўжаны да 15 гадоў, каб была ўрэгулявана справа пэнсіяў страціўшым працаздольнасьць гарнякам—работнікам, каб была вырашана справа зямельнай рэформы, каб было ўрэгулявана пытаньне аб гаспадарчых стасунках з СССР, каб было палепшана палажэньне мясцовага насяленьня ў Індыі. Лянсбэры выразіў надзею, што бліжэйшыя выбары будуць трыумфам Партыі Работнікаў і паражэньнем кансэрватараў. Партыя Працы сцьвярджае нячуваны ўзрост лічбы сваіх сяброў за апошні час. Дык ніколі яшчэ Партыя ня была такой сільнай, як цяпер.

Чэха-славацкі парлямант выдаў суду паслоў-камуністаў.

Пражскі парлямант пастанавіў выдаць суду камуніст. паслоў Муна і Кулена. Пракуратура вінаваціць паслоў у дзяржаўнай здрадзе.

Страшэнны выбух складу ваенных матар'ялаў у Мелільле.

У порце Мелільля — у Гішпанскім Марокко — 26-га верасьня ўзарваўся ў паветра адзін з фортаў, у якім было каля 20 тысячаў кіляграмаў пораху. Усе будынкі навакол форту — зьніштожаны. Забіта больш, як 3 дзесяткі асобаў і 200 ранена.

Сямейныя спрэчкі.

Апошнім часам ува ўсёй прэсе пішуць аб спрэчках сярод П. П. С. прав. Спрэчкі гэтыя стаюцца ўсё вастрэйшымі і сяньня мусім канстатаваць, што, ня гледзячы на абяцанкі Недзялкоўскага, што падзелу сярод П. П. С. няма і ня будзе — падзел фактычна ўжо наступіў. Распачалося гэта ад слаўнай брашуры Мінкевіча, садраўшай агідную дэніцыятарскую маску варшаўскага О. К. Р. з паслом Яваройскім et comp. напераддзе выказваець аканчальны развал гэтае арганізацыі, як п'янства, дэфраўдацыі, крывавую разьню першага мая, паўстаўшую супроць работнікаў П. П. С-кую баёўкаю пад павадырствам Лакешка і г. д. Калі паказалася гэная брашура, барацьба зрабілася яшчэ вастрэйшай, як пр. барацьба варшаўскай Рады Праф. Саюзаў з Цэнтральнаю Камісіяй Прафэс. Саюзаў, сарваньне адчыту Жулаўскага і іншых варшаўскай арганізацыяй, назначэньне Камісара з боку С. К. В. і г. д. Ці спрэчкі сярод П. П. С. прав. Тую, толькі арганізацыйную натуру, як хоча давесьці Недзялкоўскі ў сваіх артыкулах?

Пасьля маёвага перавароту, толькі частка павадыроў П. П. С. прав. афіцыяльна перайшла на санацыйны бок, а частка афіцыяльных санатараў, якія знайшліся ў партыі, як Яваройскі, Шчыпёрскі і г. п. хочуць зарваць з пэпэесаўскага кіраўніцтва іх аблудную маску апазыцыйную, перад урадам, якая ўзапраўднасьці аказваецца яўна папераючаю ўсе пляны санацыі і цалкавітасьць іх палітыкі і перайсьці да адкрытага падтрыманьня ўраду Пілсудскага. Недзялкоўскі мае рацыю, гаворачы, што няма ніякіх аснаўных розьніц ідэёвых пасярод адной і другой групай, дзеля таго, што як адна, так і другая не зьяўляецца нічым большым, як здраднікамі жыцьцёвых інтарэсаў працуючых масаў, што абедзьве групы, ці то ў часе барацьбы эканамічнай пралетарыяту, ці то пад час працы над камасацыяй, парцэляцыяй, ліквідацыяй сэрвітутаў, падчас працы шарваркаў і г. п., ці то ў агульнай палітыцы, не зьяўляюцца нічым болей, як агентамі буржуазіі сярод працуючых масаў, даваўшых магчымасьць буржуазіі праводжаньня ў цэльнасьці яе палітыкі здушэньня і выкарыстоўваньня работнікаў і сялян усяго краю.

Цяперашняя спрэчка гэта—спрэчка паміж павадырамі сацыял-здрады, як лепей прадаць і прымусіць працуючую масу, ці то шляхам адкрытага злучэньня з буржуазіяй, ці то пры помачы ашукоўваючых апазіцыйных манэўраў і сеяць мару гэтакім чынам сярод мас, што фактычна бароняць інтарэсы працуючай клясы і атрымаць яе даверра. Буржуазія ў сваёй палітыцы вельмі цікавіцца такімі справамі і разломамі, бо атрымоўвае гэткім чынам тое, што найбалей скампрамітаваную частку павадыроў сацыял угодзі адцягваець ад сваёй партыі і гэткім чынам адкрываець ілюзію ў масах, нібы пазасталая частка зьяўляецца вернаю барацьбе і ідэалам працуючых мас. Той самы характар развалу ёсьць цяпер пасярод П. П. С. прав. Што адна і другая група павадыроў П. П. С. прав. ёсьць складанаю часткаю буржуазнага лагеру, сьведчыць хаця-б той апошні крок у напрамку стварэньня соймавае большасьці, праз прыманку да яе элемэнтаў з вызваленьня П. П. С. прав. і т. п. Дзякуючы гэтаму факту, можам спасьцерагчы, што фарміраваньне апазіцыі да ўраду з боку П. П. С. лопаецца, як мыльны пузыр, перад канечнасьцю ўзмацаваньня буржуазнага абозу таму, што сам „апазіцыйны тэорэтык“ Недзялкоўскі піша ў Работніку, што вітаюць з прызнаньнем крокі Дашынскага і што гэта згаджаецца з палітыкаю П. П. С.

Выходзячы з гэтага, які далейшы характар спрэчак будзе сярод П. П. С. прав., не ўваходзячы ў тыя падробныя моманты і формы таго развалу, нас перадусім цікавіць ідэёвае аблічча гэтага развалу і ўсяе партыі, і тут мусім адкрыць перад масамі тое, аб чым дзесяткі разоў мы пісалі, што цяперашні развал яшчэ раз адкрыў перад масамі поўны расклад і гніцьцё тае пэпэесаўскае гангрэны. Тое, што мы пісалі праз увесь час аб тым здрадным багне, пішуць аб сабе самыя павадыры з П. П. С. прав., бо гэта заўсёды так бываець, што калі двох злодзеяў спрачаюцца між сабою, дык праўда выходзіць наверх. І адкрыць тую праўду перад масамі, што павадыры П. П. С. прав. былі і ёсьць здраднікамі працуючых масаў, што іх партыя ёсьць гнільлём і скулаю, пажыраючаю сялян і работнікаў.

Самі памаглі нам у гэтай справе спрачаючыяся паміж сабою павадыры сярод П. П. С. прав. Факты раскладу і здрады павадыроў з П. П. С. прав. павінны яшчэ раз адкрыць масам вочы і прагнаць пажыраючую гангрэну ўсюды, дзе толькі даець свае прыметы.

Гэта будзе найлепшым адказам з боку працуючых масаў на цяперашнія спрэчкі і развалы ў П. П. С. прав.

Гэта ёсьць спрэчка сярод сям'і.

Наша хроніка.

Каляндар на 1929 г. Бел. Выдавецкае Т-ва ў Вільні прыступіла да выданьня кніжкі-календара на 1929 год. Кніжка выйдзе фарматам у два разы болей, чым у мінулым годзе. Зьмест складаецца з наступных аддзелаў: літэратурнага, гістарычнага, культурна-грамадзкага, эканамічнага, гаспадарчага, школьнага, аддзелу па-за школьнае асьветы, мэдыцынскага, мастацкага, статыстычнага, каапэрацыйнага, тэхнічна-будаўлянага, інфармацыйнага і інш. У календары будзе зьмешчаны цэлы рад фатаграфій, якта: Зьездаў павятовых Т-ва Бел. Школы, бібліятэк-чытален, народных дамоў, драматычных і музыкальных кружкоў і інш. Календар выйдзе з друку у другой палове месяца лістапада.

Рэдакцыя календара просіць Грамадзян прысылаць рознага роду матарыялы літэратурнага, культурна-асьветнага і інш. характара, такжа і фатаграфіі для надрукаваньня ў календары, пакідаючы за сабою права выбара з усяго прысланага. Адрэсаваць: Wilno, ul. Ostrobramska № 1, księgarnia białoruska, dla redakcji kalendarza na 1929 r.“.

Яшчэ працэс „Грамады“. 15-га кастрычніка г. г. распачнецца ў Акружным Судзе ў Вільні другі вялікі працэс былой „Грамады“—бо аж 35 грамадаўцаў. Прэса інфармуе, быццам большая частка з падляжачых гэтаму працэсу знаходзіцца на волі (?) і навет колькінаццаць з іх выступала ў галоўным працэсе „Грамады“, як сьведкі. Гэтыя „35“ грамадаўцаў абвінавачваюцца таксама як і папярэднія грамадаўцы, у антыдзяржаўнай „шкоднай для панства“ дзейнасьці і навет з аднаго параграфу—102 К. К., толькі з іншай яго часткі—I, а ня II-ой.

Няўжо-ж і гэтыя грамадаўцы паедуць знаёміцца з заходняй культурай?

Прыгавор у справе Ц.К.К.П.З.Б. 27-га верасьня г. г. быў вынесены прыгавор ў справе 10 падсудных, абвінавачваных у прыналежнасьці да камуністычнай партыі.

Цьвяткоў (інж.-тэхналёг), Шварц, Гэлер і Дозін засуджаны на 10 гадоў цяжкага вастрогу.

Кэнігсбэрг і Кравец на 5 гадоў, Хайдна на 4 гады цяжкага вастрогу.

3-х—Бэр, Сэгаль і Адзінова апраўданы (з браку доказаў віны).

Па адчытаньні прыгавора засуджаны наладзілі „бурлівую“ (як піша буржуазная прэса) дэманстрацыю. З салі Суду вывялі іх сілаю. Прысутная ў салі маці Хайда самлела з роспачы, і толькі з труднасьцю ўдалося вярнуць яе да сябе.

Засуджаным ня прыслугоўвае амністыя.

Абшарніка апраўдалі. „Dziennik Wileński“ з дня 30. IX. у аддзеле „Z sali sądowej“ падае наступнае:

Учора Віленскі Акружны Суд пад кіраўніцтвам віцэ-старшыні Аўсянкі, судзьдзяў Бжозоўскага і Умястоўскага меў разгляд пытаньня:

Ці Стафан Вэўза, уласьнік фальварку Кавалькі, Рудамінскае воласьці, забіў на сваім полі работніка Гульбіновіча Марціна і раніў Стасюка Давэйку ў абароне свайго жыцьця, ці зрабіў праступак з арт. 45 і 453 К. К., як гэтага дамагаўся пракурор?

Гэты выпадак здарыўся ў лістападзе мінулага году. Да фальв. Кавалькі прыйшлі, маючы ў руках лапаты, якіясь чатыры асобы, і вылаяўшы спатканую перад палацам, служанку, пашлі на засеянае рэпай поле і пачалі яе рваць і падкідваць угару.

Паведамлены аб гэтым уласьнік фальварку п. Стафан Вэўза, 46 гадоў, прыказаў служанцы прынясьці рэвальвэр, і, пайшоўшы на поле, дамагаўся, каб няпрошаныя госьці сышлі з яго поля. Замест таго, каб выканаць яго дамаганьне, незнаёмыя напалі на ўласьніка. Вэўза стаў адступаць і загразіў, што будзе страляць з рэвальвэру. Аднак, яны гэтым не перапудзіліся і адзін схапіў уласьніка ззаду, а два за грудзі, павалілі на зямлю і, сеўшы на яго, пачалі біць лапатамі.

Абвінавачаны два разы выстраліў, забіў Гульбіновіча на сьмерць і раніў Давэйку. Нападаючыя адскочылі (і забітэ таксама? — Рэд.), а патурбаваны Вэўза схаваўся ў фальварак.

Гэта справа выклікала шмат пратэстаў і гутарак. Выклікана многа сьведкаў, як са стараны пракурора, так і са стараны ўдавы Гульбіновічавай, якая дамагалася 15.000 зл. адшкадаваньня.

Абвінавачваў прак. Рудкевіч. Ад імя ўдавы выступаў адвакат Чэрніхаў.

Абвінавачаны ня прызнаў сябе вінаватым, уважае гэта забойства за акт самаабароны і шкадуе толькі, што яго рука прычынілася да пагібелі чалавека. Страляў толькі ў той момант, калі яго пачалі біць і калі заўважыў, лежучы на зямлі, што намерваюцца ўдарыць лапатай па галаве.

Дапрошаныя ўчасьнікі „нападу“: Давэйка, Кулеша Пранук і Гансоўскі Тафіль паказалі, што яны, вяртаючыся з работы і будучы крыху выпіўшы, хацелі вырваць сабе па рэпіне, абвінавачаны нацэліў у іх з рэвальвэру, крычучы „камуністы“! бальшавікі! рукі ўверх“! і калі яны не паслухалі яго прыказу падняць рукі, уласьнік пачаў страляць.

Іх паказаньні зьяўляюцца для пракурора падставай дзеля дамаганьня прысуду і пакараньня падсуднага. „Сьмерць чалавека вымагае гэтага ад суду. Можа вінаваты крыху і работнікі, што ўвайшлі ў гарод, але не настолькі, каб іх страляць з рэвальвэру, гэта было правакацыяй са стараны п. Вэўзэ. Ён павінен быць пакараны, гэтага вымагае грамадзкі інтэрас“ (падкр. рэд.).

Адвакат Чэрніхаў падтрымлівае праку-

Як закладаць каапэратыў.

1. Для заложэньня каапэратыву закон вымагае, каб было бадай 10 (дзесяць) сябраў-закладчыкаў.

2. Сябры-закладчыкі павінны адбыць першы сход (арганізацыйны), на якім належыць ухваліць статут каапэратыву. Прыймаючы статут, арганізацыйны сход павінен устанавіць назову каапэратыву. Не вымагаецца, як гэта было дагэтуль, каб фірма ахоплівала прадметы дзейнасьці. Можна, напр., назваць проста: „Дабрабыт“ (ці якое іншае слова) каапэратыву з абмежанаю парукаю ў . . . . . (назоў вёскі). Трэба так-жа значыць вышыню паю і вышыню адказнасьці сяброў. Усё гэта ўпісаць да статуту. На гэтым-жа сходзе выбраць першую Наглядную Раду з 6 ці 9 чалавек, якія ўжо выбяруць і першую Управу каапэратыву ў ліку: 3-х сяброў Управы і 2-х іх заступнікаў. З арганізацыйнага сходу сьпісваецца пратакол.

3. Па адбыцьці агульнага сходу трэба падаць заяву ў Суд, аб рэгістрацыі каапэратыву і аб рэгістрацыі сяброў Управы.

4. Прыгатовіўшы заяву, належыць зьвярнуцца да грамадзкага ўраду (можна так-жа ў Суд, ці да натарыюса), каб ён сцьвердзіў (легалізаваў) подпісы сяброў Управы. Дзеля гэтага сябры Управы зьмяшчаюць свае подпісы ў прысутнасьці грамадзкага ўраду. Грамадзкі ўрад сцьвярджае подпісы бясплатна і бяз штэмпляў. Пры сцьвярджэньні подпісаў у Судзе, пабіраецца штэмплёвая аплата па 1 зл. за кожны подпіс, але ня больш 3-х злотых за ўсе подпісы. Калі пасьвядчае подпісы натарыюс, то засьведчаньне подпісаў не аштэмплёўваецца, але плаціцца натарыюсу за працу.

5. Заявы ў суд падпісваюцца фірмова г. ё.: у канцы заявы выпісваецца поўна фірма, або кладзецца яе пячатка, а пад фірмаю падпісваюцца ўсе сябры Управы. Другі раз на заяве подпісаў сцьвярджаць ня трэба.

6. Да заявы належыць далучыць: а) копію пратаколу арганізацыйнага сходу (арыгінал пратаколу мусіць быць захаваны ў актах каапэратыву). У канцы гэтае копіі належыць напісаць: „згодна з арыгіналам“, далей упісаць поўную фірму каапэратыву з подпісамі двох сяброў Управы. Пасьвядчаць копіі пратаколу ня трэба. б) Копію пратаколу паседжаньня Нагляднае Рады аб выбары Управы. Копія сцьвярджаецца тым самым парадкам і в) апрача гэтага, далучаецца яшчэ 3 экзэмпляры статуту. З іх мусіць быць адзін арыгіналам; у канцы якога падпісваюцца каля 10-х сяброў-закладчыкаў. Подпісаў іх сцьвярджаць ня трэба. Два другія статуты з надпісам ў гары: „копія“, у канцы якіх упісваюцца прозьвішчы ўсіх сяброў-закладчыкаў. Гэтыя копіі Управа сцьвярджае фірмова (не ўрадова).

7. Заява з дадаткамі ўносіцца да адпаведнага акружнога суду. Заяву належыць уносіць або поштаю заказным пісьмом, або асабіста. У апошнім выпадку трэба ўзяць з Суду пісьменнае пацьверджаньне Суду аб унясеньні заявы.

8. У тэрміне 2-х месяцаў ад уносу заявы Суд павінен зарэгістраваць каапэратыў, пераслаць у каапэратыў: а) выпіску з рэестру і б) Судом пасьведчаную копію статуту. Калі да 2-х месяцаў Суд не зарэгіструе каапэратыву, або не паведаміць аб рэгістрацыі, то каапэратыў лічыцца за праўна існуючы, а Суд мусіць упісаць яго да рэестру без усялякай зьмены.

9. Унёсшы заяву ў Суд, Управа мусіць гатовіцца да распачацьця дзейнасьці. Перад пачаткам прадпрыемства неабходна выкупіць у скарбовай касе прамысловае сьвядэцтва. Пад пагрозаю высокіх караў, а навет зачыненьня прадпрыемства, ня можна распачынаць ніякай гаспадарскай дзейнасьці (крама, малачарня і г. д.), ня выкупіўшы хаця-б на пярэдадні прамысловага сьвядэцтва. Цана прамысловага сьвядэцтва залежыць ад таго, якое прадпрыемства мае вясьці каапэратыў і ад мясцовасьці, у якой прадпрыемства знаходзіцца. На спажывецкую краму трэба выкупіць прамысловае сьвядэцтва 3-яй катэгорыі. Калі прадпрыемства пачынае сваю дзейнасьць з другой паловы году (па 1 ліпеню), то выкупляецца прамысловае сьвядэцтва на паўгода за палову цаны.

Крэдытовыя каапэратывы, што ўдзяляюць сваім сябрам ня вышэй 1200 зл., а сябром-каапэратывам ня вышэй 8,000 зл., носяць назоў „установы дробнага крэдыту“. Такія каапэратывы, калі належаць да Рэвіз. Саюзу, зусім не патрэбуюць выкупляць прамысловага сьвядэцтва.

Вось гэта — першыя практычныя рады для закладкі каапэратываў. Больш падрабязна і ясна аб гэтай справе можна дазнацца з кн. М. Манцэвіча: „Як заложыць каапэратыў“.

Ці падалі Вы ужо дэклярацыі на беларускую школу? Як ідзе у Вас справа дэкляцыяй? Пішэце у газэту і канцэлярыю Гал. Управы Т-ва Беларускае Школы.

ратара і глядзіць адначасна на справу з іннога пункту гледжаньня.

„Спаткалися двое пачцівых людзей. Адзін быў п'яны, другі цьвярозы, а п'яных не страляюць, бо-ж гэта кожнаму з нас здараецца. Але тут абшарнік, а тут работнік... Нападаючым быў Вэўзэ, бо-ж меў рэвальвэр і абразіў называючы: „камуністы"... Вэўзэ забіў аднаго чалавека, а зрабіў няшчасным другога — яго хворую жонку, якая цяпер утраціла адзінага карміцеля".

— Наўмысьня падаём пазьней паказаньні сьведкаў са стараны абвінавачанага. Дапусьцім, што іх зусім ня было-б. Справа абвінавачанага Вэўзы была-б вельмі не памыснай. Але на яго шчасьце, гэты выпадак здарыўся ў людная ваколіцы. Аказваецца, што гэтыя-ж работнікі раней працавалі на полі Каетана Рэховіча.

„Падыходзілі да капца з бульбай. Выгляд мелі нядобры. Можа і былі п'яныя, але гэтага ня можна было заўважыць".

Сьведка Штумпялеўскі, уласьнік рэстаўрацыі, гавора, што гэтыя-ж работнікі былі ў яго, штось там з'елі, далі 5 зл., а патрабавалі рэшты з 50 зл., а выходзячы праз падворак адвіталіся з работнікам, які шчапаў дрэва і сказаўшы „давідзэня", ударылі яго два разы па твары.

Сьведка кс. Леапольд Блюм гавора, што перад гэтым, тыя-ж работнікі ўварваліся ў яго гарод, пераскочылі праз плот і пачалі сеч лапатамі калючы дрот і з пагрозамі адышліся".

Як гэты, так і іншыя сьведкі, як найляпей, характэрызуюць абвінавачанага, казалі, што ён спакойны, працавіты, пачцівы, добры для сваей службы, ціхі.

Адвакат Ясінскі зьбівае вывады пракурора, што да адносіньня старон падчас выстралу і адказвае на прамову Чэрніхава — „Мы выхаваліся на заходняй культуры, не прызнаем усходняга прынцыпу: „не сопротивляться злу", а скарэй прытрымліваемся правіла „vim vi rebellere licet.

Удаводніўшы (?) паказаньнямі сьведкаў, што п. Вэўзэ страляў у абароне свайго жыцьця, затрымліваецца над галоўнымі мамэнтамі гэтага здарэньня і просіць суд апраўдаць падсуднага.

Пасьля нарады суд вынес прыгавор, якім зусім апраўдаў Вэўзэ ў забойстве і адначасна адкінуў іск жонкі забітага на 15000 зл.

Камэнтарыяў, дзеля зразумелых прычын, не падаём.

Звальненьне з вастрогу С. Астапчыка. У панядзелак, 1-га кастрычніка, звольнены з Лукішак б. заступнік сэкрэтара сэкрэтарыяту Б. С.-Р. Грамады і кандыдат сьпіску „Сялянска-Работніцкага Аб'яднаньня" па Сьвянцяншчыне — Сьцяпан Астапчык. С. Астапчык прасядзеў на Лукішках больш сямі месяцаў ад часу выбараў, калі ён быў выбраны. Выпусьцілі, як здаецца, „z braku dowodów".

Дэлегацыя ў справе Гімназіі ў Вялейцы. У суботу, 29-га верасьня, да Школьнага Куратара ў Вільні зьявілася дэлегацыя ад Бацькаўскага Камітэту — для адчыненьня ў м. Вялейцы Беларускай Гімназіі на месца закрытай расейскай. Куратар патрабаваў дадатковых даных аб матар'яльным палажэньні будучай Гімназіі, складзе вучыцялёў і інш., якія дэлегацыя мае прадставіць у найбліжэйшы час.

Акружная Управа ў Вялейцы не зачынена. У польскай буржуазнай прэсе зьявілася заметка аб тым, што Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы ў Вялейцы „завешана" — з даданьнем звычайнай хлусьні аб палітычным характары Управы. Як аказалася — гэтая заметка была звычайнай правакацыяй, разьлічанай на перапалох беларускіх працоўных гушчаў. Управа ня была прыкрыта і чынная.

Каму патрэбна гэтая правакацыя? Ці ня сеюць гэтыя хлусьлівыя чуткі новыя служкі санацыі?!

Маніліся адбіць арыштаваных. Надовячы ў вёсцы Пахомава, Віжанскай воласьці, Віленскага пав., паліцыянт арыштаваў 2-х „падазроных асобаў", у абароне якіх стаў натоўп некалькі дзесяткаў чалавек. Натоўп намерваўся адбіць арыштаваных. Паліцыянт пачаў страляць угару. Натоўп разышоўся. Паліцыя вядзе ў гэтай справе сьледзтва. („K. W. № 223).

Два студэнты з Варшавы. У буржуазнай віленскай прэсе зьявілася кароценькая заметка наступнага зьместу: „Ужо доўгі час як на радава-польскім пагранічча вядзецца, ня ведама кім, камуністычная агітацыя, заклікаючая адначасна вучачуюся моладзь, каб ехала на вышэйшую навуку ў Менск. Надовячы ў гэтай справе ў раёне Івянца затрымана 2-х чалавек, якія падаліся за студэнтаў з Варшавы.

Генаральная аблава на пагранічча. Нядаўна польскія пагранічнікі зрабілі на радава-польскім пагранічча генаральную аблаву. Арыштавана 42 асобы, сярод якіх 8 быццам камуністаў. Гэтая аблава ўжо ня першая.

„Новая пара ў беларускім руху". Гэтак азагалоўлена перадавая стацьця ў № 17 „Народу", дзе вядомы М. Прынскі факт паўстаньня Каўшоўскай арганізацыі лічыць паваротным пунктам у беларускім руху. А для нас зусім ясна, што Коўш і Янка — дзьве клячы аднае пары. Прыпомнім, што жонка Каўша ў „Гасп. Зьвязе" аж скарбніцай. Янка ў стацьці хваліць і іншых „дзеячоў". Але мы ўжо ад доўгага часу проста шкадуем іх іменьні выстаўляць на пасьмех!

З другога нумару „Белар. Зарніцы". Вышаў з друку 2-гі нумар „Бел. Зарніцы". Зьмест пачынаецца „Беларускім рэлігійным гімнам" з 6 радкоў. 4 першыя радкі наступныя:

„Краіну родную, Беларусь бяздольную,
Маці гаротную, Божа, храні.
І сыноў яе бедных, працаю замучаных,
На дарогу сьветлую, Божа напраў".

Ужо па вонкаваму выгляду гэты „беларускі" гімн далёка стаіць ад усяго беларускага, бо ў ім поўна русіцызму, як „храні", пабеларуску барані, або вартуй, залежна ад сэнсу, „напраў" — пабеларуску накіруй, пакіруй.

Са зьместу адразу-ж няпрыемна кідаецца ў вочы стараньне „Зарніцы" ўбіць бел. працоўным гушчам, што „Беларусь бяздольная", а знача ня трэба і думаць аб долі далей: І сыноў яе бедных, працаю замучаных, на дарогу сьветлую, Божа, напраў".

Як тут зразумець, што трэба ў „бедных, змучаных працаю сыноў Беларусі направіць, няма ведама — хіба пэўна рукі, каб працавалі, як машына і ня чулі ніякага цяжару, ні мукі ад гэтага, — вось дык па хрысьціянскі! Але пры чым-жа тут „сьветлая дарога"?

Пэўна многа разоў лепш было-б, калі-б аўтар і рэдактар адзін заместа пісаць, а другі зьмяшчаць такую, „казённую" бязглузьдзіцу, маліліся, каб Бог „паправіў" у іх самых тое, чаго яны хочуць, каб ён „направіў" у Беларусі, а перадусім іх галаву, у якой пэўна „ходзіць хата, ходзіць печ", асабліва ў рэдактара „Зарніцы", бо-ж аўтар, хіба, ведаў, што падаў рэдактару бязглузьдзіцу і дзеля гэтага не падпісаўся, а рэдактар, бах дый зьмясьціў.

Вось тут адразу і вылезла „шыла з мяшка", ці, як у байцы, „што кароль голы", што бачаць усе, але ня сам „кароль", што ён і яго „орган", ня „зусім незалежны", а „казённы".

Брава, сьвяшчэньнік, а перадусім былы „Грамадовец"!

Гаворачы аб „Зарніцы", нельга прамінуць артыкулу, дзе хваляцца „служкі божыя", што хрысьціянства не паклікала рабоў да паўстаньня на паноў".

Відаць, добра заплацілі. Нам прыдзецца калісь нашых чытачоў паведаміць, што „Зарніца" памерла бясслаўнай сьмерцьцю, калі не за бракам сродкаў, дык за бракам чытачоў. У век радыё, гумавых палак і фабрыкацыі працэсаў вярнуць гісторыю да сярэднявечча ня ўдасцца, хаця-б панкі са „служкамі божымі" ўздумалі ўваскрэсіць і „сьвятую экзэкуцыю".

Забастоўка ў фабрыцы кансэрваў. У фабрыцы кансэрваў, месьцячайся ў Вільні па Наваградзкай № 5, выбухла забастоўка. Работнікі дамагаюцца 25 процантаў падвышкі платы.

Крэсы „адбудоўваюцца". Віленская прэса падае, што справа будовы Гродзкага (?) Суду ў Сьвянцянах „йдзе значна напорад". Значыць радуймася! — „крэсы" значна адбудоўваюцца...

Забарона вывазу сырога дрэва. Відаць, лес ужо вывезьлі заграніцу, бо адпаведныя ўлады пастанавілі забараніць вываз заграніцу сырога дрэва, якое можа вывозіцца з Польшчы толькі пасьля яго абробкі. Гэтым думаюць спыніць пагражаючае лесапілкам беспрацоўе.

Ці ня ў час нам тут будзе прыпомніць польскую прыказку: „Mądry polak po szkodzie".

Два жыдоўскія тэатры ў Вільні. Апошнімі днямі адчыніўся ў Вільні 2-гі жыдоўскі тэатр „Навіны" (Вялікая вул.). А віленскія беларусы ўсё ніяк ня могуць зьбіцца і на адзін беларускі тэатр.

З жыцьця Горадні.

— **Субсыдыя для вучняў беларускае гімназіі.** 21-га верасьня адбылося паседжаньне Горадзенскага павятовага сойміку. Між іншымі пытаньнямі, разглядалася справа субсыдыі для незаможных вучняў, якія вучацца ў польскіх сярэдніх школах. Падчас дэбатаў над гэтым пытаньнем, беларускімі прадстаўнікамі была ўнесена прапазіцыя, каб і для вучняў-беларусаў, якія паходзяць з Горадзенскага павету, а вучацца ў Віленскай Беларускай Гімназіі, была асыгнавана субсыдыя. Большасьць сойміку да гэтай прапазіцыі аднеслася прыхільна і асыгнавала на двух вучняў, яны вучацца ў Віленскай Беларускай Гімназіі, а паходзяць з Скідэльскае гміны, на 300 зл. для кожнага.

— **Забастоўка.** Мінула ўжо тыдзень ад часу выбуху забастоўкі работнікаў і работніц кравецкай прамысловасьці. Бастуе агулам каля 80 асоб. Хутка, здаецца, гэтая забастоўка будзе зьліквідавана, бо большасьць гаспадароў пайшла на ўступку і згаджаецца здавольніць выстаўленыя работнікамі дамаганьні.

Дамаганьне было наступнае: хто зарабляў тыднёва да 10 зл., жадаў 40 проц. падвышкі; ад 10 да 18 зл. 30 проц., а ад 18 зл. і болей—25 проц. Характэрна адзначыць, што ў часе вось гэтай забастоўкі (здаецца на другі дзень як яна выбухла) работнікі і работніцы прышлі ў свой прафэсіянальны саюз „Ігла", каб урэгуляваць залеглыя сяброўскія складкі, ды каб даведацца, як ідзе забастоўка і які пануе дух у бастуючых. У часе залатвеньня вось гэтых спраў у саюз зьявіўся паліцыянт Шыпелевіч і, зьвярнуўшыся да прадстаўніка гэтага саюзу Александровіча з жаданьнем, каб ён загадаў работнікам разыйсьціся, бо, апрача сяброў „зажонду", кажа, у саюзе ніхто не павінен знаходзіцца, хоць апошні і пратэставаў проці гэтага загаду паліцыяна, але работнікам прыйшлося такі разыйсьціся. Міжволі насоўваецца пытаньне, дзеля чаго існуюць у Польшчы прафсаюзы? Ці толькі дзеля таго, каб на паперы паказаць прад культурным сьветам, што вось і мы таксама даём работнікам арганізацыі і легальна вясьці эканамічную барацьбу проці яе экспляататараў—буржуазіі?

— **Як войт з сэкрэтаром спаганяў падаткі.** Гэтымі днямі застала выкрыта, як на культурнай мове кажуць, „nadużycie", Войт гміны Парэчча, Горадзенскага пав. Антон Абухоўскі супольна з сэкрэтаром Станіславам Бахавецкім, падчас спаганяньня падаткаў з сялян, мелі падвойныя квітарыюшы. У адным з іх яны выстаўлялі такую суму, якую іхняя галава зажадала зьдзерці з селяніна, а другі квітарыюш знаходзіўся ў канцэлярыі гміны, у якім выстаўлялі правідлова, колькі вызначана праз урад. (Ведама, што наш селянін ведае, колькі з яго прыходзіцца падаткаў? — ці правідлова ён плаціць іх ці не, бо амаль ня кожны дзень яго, беднага, клічуць у гміну, каб нёс грошы). Даволі таго, што спаганялі яны, спаганялі ды спагналі больш як трэба на 1887 зл. і 59 грошы, якія пайшлі ў іх уласны кішэнь. Як бачым, дык і воўкі сытыя і авечка цэлая т. ё. і поўны кішэнь і ў канцэлярыі „wszystko w porządeczku".

А. Р. К.

З Т-ва Бел. Школы.

З Працы Гурткоў Т-ва Бел. Шк.

✕ 18 траўня 1928 г. Тапільскім гуртком Т-ва Бел. Шк. быў наладжаны збор ахвяраў, які даў 47 зл. 13 гр. Ахвяры пайшлі: 1) 25% на карысьць бібліятэкі-чытальні ў в. Тапількі—Беласт. пав. і 2) 75% на карысьць Беластоцкай Акружной Управы.

21 траўня 1928 г. Беластоцкая Акружная Управа Т-ва Бел. Шк. ладзіла ў м. Супрасьлі Беласт. пав. публічны збор ахвяр. Сабраныя грошы ў суме 50 зл. пайшлі на карысьць бібліятэкі-чытальні пры гурт. Т-ва Бел. Шк. ў Беластоку. 19 жніўня 1928 г. Беластоцкай Акружной Управай Т-ва Бел. Школы была наладжана ў м. Гарадку Беластоцкага пав. публічны збор. Ахвяраваныя грошы ў ліку 93 зл. 06 гр. пойдуць на будову Народнага Дому пры Беластоцкай Акружной Управе. Усім ахвярадаўцам, як і асобам браўшым удзел у наладжаньні збораў, Беластоцкая Акружная Управа прыносіць шчырую падзяку.

✕ **Наш Гурток Т-ва Бел. Школы** (в. Балотца-Клінцы—Шчарсоўскае гміны) Дзякуючы высілкам і ўпартай працы сьвядомых хлапцоў, у нашай вёсцы ад канца 1927 г. існуе гурток Т-ва Бел. Школы.

Пры гуртку ёсьць бібліятэка-чытальня, дзе, замест напіцца гарэлкі і пабіць адзін аднаго, можна пачытаць газэту, ці кніжку. Ад новага году паставілі 7 спэктакляў, даход ад якіх пашоў на культурна-асьветныя мэты. Праўда, шмат прыходзіцца цярпець насьмешак і крыўды ад сваіх братоў-сярмяжнікаў, каторыя яшчэ служаць богу цемры, ня кажучы аб тых крыўдах, каторыя дазнаем з боку ўлады. Але тая сьветлая мэта, якую мы бачым уперадзі, дае нам сілы перамагчы ўсе перашкоды. І пераможам.

✕ У суботу 8 га верасьня г. г. Баранавіцкім гуртком Т ва Бел. Школы была наладжана вечарына. Адбыўся першы канцэрт уласнага струннага аркестру Т-ва пад кіраўніцтвам гр. У. Аляксеева. Бязупыннае „брава, біс" грымелі на ўсю залю, як і заўсёды, поўную глядзельнікаў.

Далей гр-ка Галавіначанка выканала балетныя нумары, здабыўшы гучныя воплескі і пахвалу публікі, закідаўшую яе краскамі. Пасьля кароткага перапынку згуляна камэдыя ў 1 акце „Міхалка".

На закончаньне пастаўлена была камэдыя „Хірургія"—Чэхава, перароблена з расейскага. Пасьля спэктаклю адбыліся скокі да гадзіны 5-тай раніцы.

Гурток складае шчырую падзяку ўсім прысутным на вечарыне, а так-жа сябрам і ня сябрам гуртка за прыхільны ўдзел пры арганізацыі вечарыны.

Далей, далей да працы, маладыя сілы Баранавіцкага гуртка, будаўнічыя роднае культуры!

✕ **Наша праца** (в. Залесьсе II, Пружанскі пав.). Існуе ў нас Гурток Т-ва Бел. Шк. ўжо ад 1926 году, але толькі на паперы, бо ўсяго паставіў толькі адзін спэктакль.

Падамо тут факты, якія прычыніліся да яго застою. Папершае, перашкоды з боку адміністрацыі, а другое, мала сьвядомых добра сяброў, якія маглі-б зразумець, што значыць культурная праца, яны маюць у галаве адно: „Давай вып'ем, усяроўна памрэм?

Браты, выкіньце гэтую думку з галавы, а, давайце, возьмемся энэргічна за культурную працу!

Возьмем прыклад з Глудзенскага гуртка! Калі-ж ня хочаце зразумець добрых заклікаў, дык мы вас выкінем з сваіх радоў. І хай вам тагды будзе ганьба ад беларускаг народу.

Дык яшчэ раз кажу, разьвітайцеся з гэтым словам „Давай вып'ем", бо ўсяроўна памрэм" ды возьмемся за працу, як іншыя гурткі Т-ва Бел. Школы.

Абвестка.

Баранавіц. Акружная Управа Т-ва Бел. Школы просіць усіх грамадзяне, Баранавіцкага павету ўва ўсіх справах, датычачых Т-ва зварочвацца па адрэсу: Баранавічы, вуліца Шосова № 97. Пётр Куптык.

Управа.

Талеранцыя на экспорт.

У той час, калі панская прэса, як у польскай, так і беларускай мовах, трубіць аб якімсь „новым курсе" для беларускай справы; калі рэгіяналісты так „шчэдра" „дараць" нас (на паперы) школамі — робяцца рэчы, якія ў найбольшай меры сьведчаць аб праўдзівасьці гэтых „курсаў" — рэчы, якія падкрэсьліваюць увесь апартунізм тых, хто прыкідваецца нашым прыяцелем, хто нібы шчыра хоча вырашыць нашу праблему.

Гурток Т-ва Бел Школы ў Сьвіслачы, здабыўшыся на сродкі, заарэндаваў у Сьвіслацкіх прыхаджан царкоўны дом, з мэтаю ўжыць яго для культурных патрэб. Дом быў вельмі зьнішчаны і, каб прывесьці яго да годнасьці, Гурток Т-ва Бел. Школы затраціў да 700 зл. грашыма, апрача фізычнай працы ўсіх сяброў Гуртка.

Калі рэмонт упамянутага будынку закончыўся, а за пару дзён мела быць перанесена ўжо бібліятэка-чытальня і канцэлярыя Гуртка — раптоўна зьявілася паліцыя і дом запячатавала, тлумачачы, што робіць гэта па загаду павятовага каманданта з тэй прычыны, што Гурток ня меў дазволу на права рэмонту.

Зараз жа па гэтым выпадку Управа Гуртка зьвярнулася да Ваўкавыскага старасты з просьбай зьняць беспадстаўнае апячатаньне будынку, але атрымала адказ: што адпячатаньне адбудзецца па агледзінах будынку адносная камісіяй, якая ўстановіць годнасьць дому. Праходзіць амаль не паўгоду, а, замест камісіі, атрымоўвае старшыня Гуртка павестку на суд за... нелегальнае адчыненьне Народнага Дому. Адбыўся суд і, не знайшоўшы віны, старшыню Гуртка Суд унявініў, а будынак пастанавіў адчыніць.

З нецярпеньнем і з якімсь незразумелым чуцьцём Гурток чакаў, калі нарэшце, можна будзе выкарыстаць плады сваей доўгай і ўпартай працы, ужыўшы дом для бібліятэкі-чытальні, дзе-б у вольную хвіліну, у часе фізычнага адпачынку, правясьці яго за кніжкай, газэтай, з затаёнай трывогай чакана, што прыдзе час, калі маючы адпаведнае памешканьне даецца яшчэ з большым запалам і энэргіяй кінуць усе свае сілы на барацьбу з цемрай.

Аднак, ня доўга прышлося чакаць. „Талеранцыя на экспорт" зрабіла сваё, выяўляючы лішні раз усю нікчэмнасьць тых пекных слоў, якія пярэчаць чынам... Будынак гуртка і сягоньня стаіць запячатаваным, бо падана апэляцыя ў Акружны Суд з просьбай аб „суровае ўкараньне" старшыні Гуртка за іхноў, нелегальнае адчыненьне Народнага Дому.

Як-бы запраўды тут ходзіць аб гэтае суровае ўкараньне(?) Калі-б так, то той, хто выклікаў працэс, маючы магчымасьць укараць за падобныя ўчынкі (калі-б якія ўзапраўды былі) спосабам адміністрацыйным — не пашкадаваў-бы гэтай „суровай". Але тут справа мае зусім іншую мэту, а мэта гэтая — ня даць магчымасьці выкарыстаць заарэндаваны дом Гуртка, а справу як найдалей працягнуць, каб наразіць самы Гурток на страты, бо, ня гледзячы на тое, што дом запячатаваны, усё-ж за яго Гурток плаціць арэнду.

Дык вось, як апякуюцца разьвіцьцем самаасьветы, вось як талеруюць узапраўды кожны поступ беларускіх працоўных гушчаў! Вось, дзе рэалізуюцца гучныя рэклямы бэбахаўцаў!

Выхад з гэтага ўсяго добра ўсьведамілі сабе ўсе тыя, хто пайшоў на змаганьне за долю працоўных, гэты выхад зразумелі і самі працоўныя, ведаючы, што сілы іх магутнага поступу наперад — падобнымі фіглямі не аслабіш, а прыдасі гарту і вытрываласьці ў далейшым змаганьні.

Ланцэт

КУТОК МОЛАДЗІ.

Ад Рэдакцыі.

Ужо ад цаўжэйшага часу мы думалі выдаць спэцыяльны дадатак моладзі, каб такім чынам усе-бакова высьвятліць жыцьцё і барацьбу беларускай сялянска-работніцкай моладзі ў той момант, калі буржуазія і сацыял-згода запаўняюць рынкі сваімі лістоўкамі, маючымі за заданьне атруціць шавіністычным духам і мілітарызмам, калі беларуская ўгода стараецца ануляваць дасягненьні беларускай моладзі—прыступаем да выдаваньня нашага дадатку з мэтай асьвятленьня ўсіх балячак працоўнай моладзі места і вёскі, паказаць ёй дарогу да палепшаньня сваей долі і вызваленьня. Зусім ясна здаем сабе справу з тых труднасьцяў, якія стаяць на дарозе ў рэгулярным выдаваньні нашай газэты. Перадусім кватыя распаўсюджаньня газэты і рэгулярны грашовы зварот, як таксама мэта газэты, якая стаіць на грунце шырокіх сялянска-работніцкіх масаў. Выпаўніць гэтае заданьне зможам толькі пры актыўнай дапамозе з вашай стараны. Мы глыбока перакананы, што першы наш шаг узбудзіць у радох сялянска-работн. моладзі запал да працы, і яна прыйдзе нам з дапамогай, праз прысыланьне артыкулаў, карэспандэнцыяў і вершаў аб жыцьці вашым у месьце і вёсцы — з гэтым глыбокім перакананьнем мы прыступаем да працы. З гэтай мэтай павінны паўстаць на вёсках і гарадох гурткі прыхільнікаў нашай газэты, каторыя будуць распаўсюджваць газэту і прысылаць нам артыкулы і карэспандэнцыі аб жыцьці працоўнай моладзі места і вёскі. Прыступайце энэргічна да працы!

Першы Зьезд Моладзі ППС лявіцы.

5—6 жніўня 1928 г. ў м. Кракаве адбыўся Першы Зьезд Дэлегатаў Гурткоў Моладзі пры П. П. С. лявіцы. Зьезд гэты адбываўся ў той час, калі імпэрыялісты усіх краёў стараюцца ўцягнуць у свой лягер шырокія працоўныя масы, а перадусім моладзь і вясьці іх супроць працоўных іншых нацыяў. Першы Зьезд пралетарскай Моладзі меў на мэце ўзбудзіць сацыяльнае пачуцьцё ў маладых работніцкіх сэрцах, адчыніць ім вочы перад запраўднасьцю, і паказаць шлях, па якім павінна ісьці працоўная моладзь.

На зьезд прыехала 32 дэлегаты з розных куткоў краю, як з Беларусі, Галіцыі, Варшавы, Лодзі, Заглэмбя, Горнага Сьлёнску і Цешыноку з вокругам Кракава, каб сумольна выказаць свае балячкі, а таксама выпрацаваць лінію для далейшай працы сярод моладзі.

Зьезд адчыніў пас. Чума. Пасьля адсьпяваньня „Інтэрнацыяналу“ прынялі наступны парадак дня:

1. Выбары прэзыдыуму Зьезду.
2. Прамова гасьцей.
3. Справаздача Цэнтр. Аддзелу Моладзі а таксама з паасобных вокругаў.
4. Палітычная і эканамічная сітуацыя работніцкая моладзь.
5. Мэты і заданьне арганізацыі.
6. Арганізацыя і прэса.
7. Выбары Цэнтр. Аддзелу Моладзі.
8. Вольныя прапановы.

Па выбарах прэзыдыуму прамаўлялі прадстаўнікі ад паасобных аддзелаў.

Пабожняк сказаў ад імя ОК П. П. С. лявіцы ў Кракаве, Бартошак ад імя Хімічнага Саюзу ў Чахавіцах, і ад імя левых Прафсаюзаў Шадкоўскі. Пасьля быў прачытаны ліст Саюзу Сацыялістычнай Моладзі.

Дзякуючы забароне ўладаў, ліст ад Цэнтральнага Камітэту Саюзу Камуністычнай Моладзі ня быў адчытаны.

Далей Дыямантава, здаючы справаздачу ад Цэнтральнага Аддзелу Моладзі зазначыла, што некаторыя вокругі ўжо з'арганізаваныя, як Басэйн, Сьлёнск, Пазнань, Лодзь, Варшава, Кракаў, а другія ўжо блізка да з'арганізаваньня. Далей зазначыла, што, ня гледзячы на цяжкія варункі, бо шырыцца тэрор фашызму, капіталісты стасуюць рэпрэсіі. Пры гэтым фашызму, капіталістам і абшарнікам, як верны служка прыслужваецца сацыял-угода.

Далей былі прачытаны чатыры рэфэраты: аб палітычнай і гаспадарчай сітуацыі, аб дапамозе работніцкай моладзі, аб мэтах і заданьнях арганізацыі і аб арганізацыі і прэсе.

У дыскусіі, між іншым, сьцьвердзілі, што буржуазія творыць розныя свае арганізацыі, як Strzelec, Сакол, Тур, Югондбунд, Цукунфт, Фрэйгайт і падобныя. Гэтыя арганізацыі моладзі маюць на мэце з'арганізаваць работніцкую моладзь, каб потым ужыць яе супроць сялянска-работніцкага вызваленчага руху. Пасьля гэтага наступілі выбары ў Цэнтральны Камітэт. Выбраны прадстаўнікі з Лодзі, з Данброўскага Басэйну, з Вільні, з Львова і з Варшавы.

З жыцьця працоўнай моладзі.

Як прайшоў Міжнародны Дзень Моладзі?

Дзень моладзі ў Львове. 2-га верасьня адбыліся ў Львове дэманстрацыі работніцкай моладзі. З сьцягамі ў руках, сьпяваючы рэвалюцыйныя песьні, работніцкая моладзь дэманстравала паходамі на шмат якіх вуліцах. Да сабранай на пляцы Сольскага дэманструючай моладзі прамаўляў пасол Вальніцкі. Разганяючы дэманстрантаў, паліцыя арыштавала больш як 20 асоб.

Некалькі дзён перад днём Моладзі арыштавана ў Львове каля 40 чалавек.

Дзень моладзі ў Драгабычы. У нядзелю 2. IX. моладзь усіх прафсаюзаў арганізавала маніфэстацыйны паход, у якім узяло ўдзел некалькі сот асоб. Дэманстранты нясьлі сьцягі з лёзунгамі і з пяяньнем рэвалюцыйных песень спакойна зьбліжаліся да рынку. Тут перапыніў паход аддзел паліцыі і, разагнаўшы дэманстрацыю, зрабілі шмат арыштаў.

Сход Моладзі і Кабет віленскіх шк. гут.

30 верасьня с. г. у памешканьні ППС лявіцы адбылася масоўка моладзі і кабет, якія працуюць на віленскай гуце. Па выясьненьню значэньня Прафэсіянальнага Саюзу, а таксама аб чынным удзеле ў урадзе Прафсаюзу прадстаўнікоў ад Моладзі і Кабет, пастанавілі: дамагацца ад існуючага Прафсаюзу заложэньня „Фабрычнага Гуртка Моладзі“ і прыняцьця ў Урад прадстаўніка ад яго, а таксама аб стварэньні „Сэкцыі Кабет“ пры Прафсаюзе гутнікаў.

Прысутныя работніцы і работнікі, канстатуючы той факт, што ў Прафсаюз прымаліся да гэтага часу толькі майстры, а Моладзь, Кабеты і падзёншчыкі не прымаюцца, дык сучасны Урад Прафсаюзу ня будзе магчы паслаць адпаведных прадстаўнікоў на „Зьезд Гутнікаў“ на дзень 7-га кастрычніка, каторыя змаглі-б бараніць інтарэсы найбольш эксплёатуемых і пакрыўджаных г. зн. Моладзь і Кабет.

Сабраная Моладзь і Кабеты пастанавілі правясьці агітацыю за скліканьне агульнага сабраньня Моладзі і Кабет з віленскіх гутаў і выбраць прадстаўнікоў, якія-б сапраўды баранілі на Зьездзе іх інтарэсы.

Сход закончыўся агульным пяяньнем „Ад веку мы спалі“ і „Międzynarodówki“.

Вось дачакаліся!

У сувязі з тым, што 2-га верасьня г. г. у м. Слоніме было вывешана шмат камуністычных сьцягоў з антыдзяржаўнымі лезунгамі і раскідана шмат камуністычнай літэратуры — паліцыя выдала распараджэньне і права рабіць вобыскі па 9 гадз. вечара ў тых асобаў, каторыя будуць хадзіць па вуліцах. Вось, дык, на табе, моладзь яшчэ адну палёгку. Працуй, працуй цэлы дзень, а прыдзе вечар — ня выходзь на вуліцу на прагулку.

Арганізацыя працоўнай моладзі.

Нядаўна пры Віленскім Акружным Камітэце ППС Лявіцы заложана сэкцыя працоўнай моладзі. Патрэба падобнай арганізацыі адчувалася ўжо даўно.

Беларуская працоўная моладзь, ня маючы свае „ўласнае“ арганізацыі, павінна масава ўступіць у сэкцыю ППС Лявіцы і правясьці там шчырую працу на карысьць вызваленьня працоўных.

Праўдзівае аблічча ППС правіцы.

„Robociarz“ падае, што ўвесь час мы кажам і пішам, што ўрадавыя лідэры ППС правіцы знаходзяцца на службе ў буржуазіі і спаўняюць загады і волю капіталу.

У гэтым цьверджаньні няма і ўзапраўды ані слова пераацэнкі, бо ня зломныя факты паказваюць нам ясна, чым зьяўляецца ППС правіца і якую ролю спаўняе. Гэтая партыя спаўняе свае агідныя заданьні, шыручы сярод працоўнае моладзі шовінізм, а арганізацыі праз іх апакаваньне выхоўваюць моладзь у духу імпэрыялістычным і буржуазным.

Ужо 30 гадоў, як існуе на Цешынскім Сьлёнску работніцкая культурна-асьветная арганізацыя „Siła“, каторую пэпэсаўскія манэкены ў часе плебісцытавай барацьбы ўжывалі для агіднай пагромнай работы.

У маі 1921 г. Галоўная Ўправа „Сілы“ разаслала да ўсіх гурткоў наступны камунікат.

„Абвод Цешынскі, дня 11 мая 1921 г.
Адозва.

Сабраныя прадстаўнікі ўсіх саюзаў, вайсковых арганізацыяў і спартова-гімнастычных заклікаюць усіх сваіх сяброў здольных для службы ў справе, каб па поваду стварыўшайся грознай сітуацыі на Горным Сьлёнску, зьвярнуліся, як найхутчэй, да сваіх арганізацыяў, гдзе атрымаюць інфармацыі да якой службы будуць вызначаны.

Заключанае завешаньне аружжа ня можа ўсыпіць грамадзянскае гатоўнасьці, але павінна скупіць усе сілы можа ўжо да астатняга высілку. Толькі аднальітая карная арганізацыя можа давясьці нас да перамогі.

За Таварыства „Сакол“: д-р Ян Галіч.
За Ставажышэньне „Сіла“: Махэй Язэп.
За Каманду Дружыны Гарц.: Гайдук.
За Саюз Став. Моладзі Каталіцкай:
Кс. Білко Леопольд.
За Стралецкі Саюз: Вольфрам Война".

Паміж адкрытымі фашыстамі і эндэкамі—камунікат гэты надпісаў таварыш Язэп Махэй, сучасны сьлёнскі пасол на Сойм з ППС правіцы. Камунікат быў рассыланы да ўсіх гурткоў „Сілы“ з дапіскаю: „трэба склікаць пасяджэньне „Сілы“ і падаць да ведама, як загад Галоўнае Управы“.

Вось гістарычны довад, чым зьяўляюцца пэпэсаўскія арганізацыі моладзі.

Аблічча „Strzelca“.

Аднадзёўка моладзі ППС лявіцы—„Młody Robociarz“ з месяца жніўня падае вельмі характэрныя весткі аб „Strzelcu“. Між іншым, там чытаем:

„Strzelec“ ніколі не прызнаваўся яўна да свайго буржуазнага характару, скіраванага супроць сялянска-работніцкага руху. Наадварот, карыстаўся з таго, што на яго нападала прадстаўніцелька польскай буржуазіі—эндэцыя, каб удаваць „левую“, сялянска-работніцкую арганізацыю.

Дзеля гэтага нас вельмі цешыць тое, што ў апошніх нумарох „Strzelca“ знаходзім урэшце яўнае прызнаньне да буржуазнай крэўнасьці. Галоўны стральцавы публіцыст п. Тытус Чакі захапляецца ў № 30 „Strzelca“ з 4. VIII г. г. нямецкаю арганізацыяй „Стальгэльм“ — выказваючую, паводлуг яго, „вялікую падобнасьць да стралецкага саюзу“.

А трэба ведаць, што „Стальгэльм“, ёсьць „баюўка“ нямецкіх нацыяналістаў—арганізацыя зусім манархістычная і рэакцыйная.

Адну толькі бачыць п. Чакі розьніцу: гэта тое, што „Стальгэльм“ апіраецца на абшарніках і на цяжкім прамысьле“.

Гэта, аднак, ня значыць, каб п. Чакі быў з гэтага незадаволены. Не,—ён толькі робіць закіды польскаму абшарніцтву і буржуазіі за „барацьбу“ са „Strzelcem“.

„Прычынаў да гэтай барацьбы, гэтай ненавісьці зусім слушна скардзіцца „перасьледаваны п. Чакі, абшарнікі і капіталісты супроць „Strzelca“ ня мелі і ня маюць. Навет, наадварот, бо „Strzelce“ ўжо шмат прыслугаў аддаў фабрыкантам і абшарнікам.

Але што на гэта ўсё кажуць сяляне і работнікі, якія яшчэ знаходзяцца ў Strzelcu?

Бо нямецкія работнікі даўно ўжо пазналі, што такое „Стальгэльм“. Тыя, якія ў ім знаходзяцца, стала тэрорызуюцца—абшарнікі ў шмат частках Нямеччыны прымаюць парабкоў толькі праз „Стальгэльм“. Да сяньняшняга дня ўспамінаюць бэрлінскія работнікі зьезд „Стальгэльму“ 8 мая 1927 г. ў Бэрліне, калі Стальгэльмцы маршыравалі пад патройнаю абаронаю паліцыі па ўпрыгожаных на—чырвона вуліцах сярод лёзунгаў: Ганьба! Сьмерць фашыстам! Бэрлін застанецца чырвоным! — сярод зыкаў „Інтэрнацыяналу“, акружаныя работніцкімі масамі. Яшчэ напэўна памятаюць н. п. Стальгэльмцы той град каменьняў і адломкаў вуглёў, якімі на зьезьдзе ў Гамбургу 1928 г. прывіталі іх партовыя работнікі.

Ды, нарэшце, сялянам і работнікам, знаходзячымся ў Strzelcu, таксама спадае ўжо туман з вачэй: „Камандант з Стралецкага саюзу мае справы з моладзьдзю і грамадзянствам паваенным, на каторых вайна пакінула цэлы рад ад'емных упłываў і вынікаў (напр. імкненьні селяніна да абшарніцкай зямлі, а імкненьні работніка да людзкага жыцьця—прып. „M. R.“)—бядуе ў „Strzelcu“ з 21. VII г. г. п. Кежкоўскі. „Цяперашні стралецкі аддзел — гэта сыры матэр'ял на грамадзяніна-жаўнера“.

Як відаць, „выхаваўчая“ праца над гэтым матэр'ялам спаткае на сваім шляху нейкія вялікія труднасьці, якія знаходзяцца ў праклятым клясавым інстынкце работніка або селяніна, бо інакай нашто-ж былі-б прысягі п. Кежкоўскага ў імя „адналітасьці стралецкай“ для абароны капіталістаў і абшарнікаў.

Далей п. Чакі захапляецца арганізацыяй моладзі „Стальгэльмам“ і радзіць перанясьці яе практыку ў Польшчу. „Сялянская і работніцкая моладзь чакае, што ёю займецца Стралецкі Саюз“ — выказвае ён у сваім артыкуле.

„Сялянская і работніцкая моладзь чакае“...—гэта памылка, непаразуменьне п. Чакі. Моладзь ня толькі не чакае, але і ведаць ня хоча. Ня толькі знаць ня хоча, але і вядзе барацьбу з тымі, да якіх капіталісты і абшарнікі „ня маюць прычынаў да ненавісьці“. Змагаецца да апошняга. Бо гэтая сялянская моладзь душыцца без зямлі ў цеснай вёсцы побач з вялікімі панскімі абшарамі; бо гэтая работніцкая моладзь лье крывавы пот за залатоўку па 10 гадзін у дзень для капіталістаў. Для яе няйсца ня ў польскім „Стальгэльме, які шукае ласкі ў капіталістаў і абшарнікаў. У кожным разе на гэтую новую офэнзыву „Strzelca“ на моладзь мусяць зьвярнуць увагу клясовыя арганізацыі пралетарскай моладзі.

Зьмяшчаючы ў радзе нумароў нашай газэты асобным аддзелам хронікі „З жыцьця Горадні — ня можам ня выказаць пажаданьня, каб, і другія нашы буйныя цэнтры, як Беласток, Баранавічы і інш., мелі таксама свае асобныя аддзелы, бо такім чынам мы будзем мець больш ведамасьцяў з сьвядомага пралетарскага жыцьця. Падаем гэта да ўвагі нашым карэспандэнтам.

Бруд.

Пісаць аб Янку Станкевічу запраўды ня хочацца. Прайшоў ужо даволі вялікі кавалак часу ад выпуску № 16 „Народу“, дзе зьвіхнуты „наўчовы доктар“ так паказаў сваю „наўчонасьць“ у форме прост бруднай лаянкі. За гэты час жыцьцё, бяз жаднае ўвагі на падобныя выбрыкі, пашло далей сваей дарогай, надыйшлі больш актуальныя маманты, якія патрабавалі высьвятленьня, выйшаў навет № 17 „Народу“, яскравыя красачкі з якога падаём у „Хроніцы“ — і на адказ Янку проста ня было месца. „Знамяніты“ „орган“ так далёка адыйшоў ад прынятых газэтных звычаяў, што, паміма ўсяго, паважная палеміка з ім немагчыма і мог найхутчэй быць адказ фэльетоннага характару.

Аднак, прыходзіцца адказваць — за няіньшым ўсьпешнае брукавае газэты — стаяць усе „скамарохі“ санацыі, ды і запраўдныя „санацыйныя“ зубры пільна сачаць за сваім выбранцам, які, хоць і ў карыкатурным відзе, але ўсё-ж шчыра стаіць на варце іх інтарэсаў, робячы з сябе ламістрайка і разам горохавага шута ў беларускім вызваленчым руху.

„Не дамося зьбіць зь беларускае дарогі“ — так загалоўлены артыкул у „Народзе“, дзе Максім Прынскі (псэўданім вядомы чуць ня з першага „публіцыстычнага“ выступленьня Янкі Станкевіча) — дае „адказ“ на „Камунікат Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу“, раскрываючага запраўдны твар новастворанных Станкевічаўскіх групаў. Аднак гэта не адказ, а проста брудная лаянка выйшаўшага з роўнасьці „дзікага пасла“, бо запраўды такія выразы, як „дварчанінаўскія жулікі“, „жулікі—хуліганы“ „схапіўшы жуліка за карман“,—гадзяцца толькі на грамадзкі сьметнік, якім запраўды і зьяўляецца „Народ“. Ясна, што падобныя словы нікога не кампрамітуюць, а сьведчаць толькі аб вельмі нізкім зроўні аўтара артыкулу, чаго ня хочам у яго адбіраць. Можам выразіць толькі зьдзіўленьне, што „санацыя“ можа паважна разьлічваць на такога памочніка і артысту грубых фарсаў на беларускім грунце.

Аб'ектам нападу М. Прынскага, ці таго-ж самага Янкі, стаўся на гэты раз пасол І. Дварчанін, які на дзікай логіцы Янкі, адказвае на гэты раз за выданьне камунікату, падпісанага найупłывовейшай у краі арганізацыяй. Каб гэта было-б зроблена кімсьці паважнейшым, як псэўданім М. Прынскі, і пры тым наагул паважна, дык гэта, пэўне, рабіла-б гонар паслу І. Дварчаніну, бо яго тут уважаюць, як відно, галаўнейшым рэпрэзэнтантам беларускае сялянска-работніцкае думкі, але падобны атэстат ад „наўчонага“ Я. Прынскага гэтага гонару ня робіць. Дык трэба аднясьці ўсе словы, датычныя пасла Д., да звычайнай бабскай лаянкі з боку раззлаванага Янкі, які, відаць, ня можа скрыць сваей асабістай злосьці.

„Мілы“ Янка трэбуе довадаў на тое, што яго падтрымвалі „высокія сфэры“ пры выбарах. Дык скажам Паўлючку, што мы пры дагаворы ня былі, і поўныя архівы для нас пакуль недаступныя, а што Вы разьяжджалі цэлы час на аўце ды Вашымі нумарамі ды пасьведчаньнямі прыкрываліся, як легітымацыяй палітычнай надзейнасьці — дык гэта ведаем. А довады post factum ужо пэўныя. Вас весь назначаюць прафэсарам унівэрсытэту, Вашы арганізацыі легалізуюць з шпаркасьцю маланкі, вы ходзіце перад „адзінкай“ на цыпках, езьдзіце на міністэрствах, ваяводзтвах—Вы, адным словам—усюды свой чалавек. Дык ці не даволі будзе Вам гэтых? Рэшту — дамо напэўна пры іншых абставінах, будзьце пэўны. А што да штрафаў і арыштаў, як таксама скасаваньня Вашых сьпіскаў у Сьвянцяншчыне — дык можа ўжо Вас запэўнілі, што гэта былі „прыкрыя непаразуменьні“ між сябрамі.

Янка для доказу надзейнасьці свайго выбарнага сьпіску ў вачох беларускіх сялянска-работніцкіх мас, пакликаецца на пасла Ф. Валынца, цяпер сябру Сялянска-Работніцкага Клюбу, які прайшоў па адным сьпіску з ім. Апошні, будучы стала на правіцы, быў ашуканы Янкам, які выстаўляў сябе проста грамадаўцам і свой сьпісак нібы падаваў на выпадак скасаваньня сялянска-работніцкіх сьпіскаў (проста, як ведаў!) па Лідзкай Акрузе і дэкляраваў, што калі пройдзе, дык будзе дзяржацца ў Сойме з сялянска-работніцкімі пасламі. Ведаем, што падаўцы падобнага сьпіску па Навагрудчыне навет пісалі забавязаньне, што будуць дзяржацца „ідэалёгіі Б. Тарашкевіча“. Пасол Валынец пасьля выбараў, як забавязаўся, так і зрабіў, а Янка — зрабіў, відаць, па другому забавязаньню. А гэта ці ня доказ здрады?

Вельмі цікавым для „Народу“ і М. Прынскага сьвядомы падзел між б. Грамадой і цяперашнім Беларускім Сялянска-Работніцкім Клюбам, пры чым Грамада выстаўляецца нацыянальнай арганізацыяй, а Б. С.-Р. Клюб — інтэрнацыянальнай. Бязумоўна гэта сьмешна з боку, але — да таго прыпомніць трэба Янку, што пад яго кіраўніцтвам і навет чуць не з-пад яго пяра ў свой час „Сялянская Ніва“ пісала, што ў Радавай Беларусі Грамада была-б урадавай партыяй. Усе ведаюць, што ў СССР адзінаю ўрадаваю партыяй зьяўляецца партыя камуністычная, дык, значыць тады Янка Грамаду лічыў таксама „інтэрнацыянальнай“ і, як помнім, па прыезьдзе з Прагі баяўся заходзіць да грамадаўскіх дзеячаў. А вось цяпер Грамады няма, дык Янка прызнае яе нацыянальнай.

Для нас ясна, што Янка падшываецца пад Грамаду (яму гэта дазваляюць), як падшываўся ў часе выбараў, калі выдаваў „На-

ду Бацькаўшчыну", падобную радыкальным газэтам, калі апошнія наўрад канфіскаваліся. Іаго добрага й гэта ня довад! Для чаго адшываецца Янка пад Грамаду? Ясна, каб туманіць працоўныя гушчы і падвясьці іх пад панскі капыт. Але трэба быць наіўным, каб у гэта верыць. Няхай Янка будзе спакойным — беларускія сяляне і работнікі куды больш палітычна сьпелыя, як ён сам. Не замогуць і дзяціныя казкі аб „беларусах чарашняга дня". А што да дапамогі Янкі ў працэсе Грамады, дык ён там даў, не мякуючы, як той заяц кабыле. А што да правакацыі на працэсе, дык яна зарадзілася, хіба, толькі ў галаве Янкі, якому ўжо не першы раз хочацца ўкусіць нялюбых „інтэрнацыяналістычных". Але гэта абсалютна нікому не баліць, а толькі йдзе на пажытак у сэньсе павышэньня ў „слаўнай", службе тамуж Янку, які проста робіць даносы! Грамадаўцы не патрабуюць напэўна такога абаронцы і, калі-б іх хто правакаваў, дык маюць магчымасьць самі аб гэтым сказаць!

Для апраўданьня сябе Янка выстаўляе свае папярэднія „заслугі", у справе Т-ва Бел. Школы і Гімназіі і прыкрываецца вядомымі іменьнямі. Але што мае гэта супольнага з цяперашнім прадажніцтвам? Што да „Родных Гоняў" — дык праўда, што Янка зьняславіў іх у вачох працоўных гушчаў. Гэта таксама належыць да прадвыбарных доказаў, да падгатоўкі да іх, і справа „Родных Гоняў" чакае свайго высьвятленьня. Скажам толькі, што ў апошні час яны былі зусім збайкатаваны запраўднымі прадстаўнікамі сялянска-работніцкай думкі і зрабіліся чуць ня органам мэтадыстаў. Слава невялікая! Але можа калі, як Янка дамагаецца, высьветлім гэтую справу падрабязьней.

У канцы стацьці М. Прынскі кажа, што Паўлюкевічу, Умястоўскаму і Вярнікоўскаму загадваюць палякі—дык яны нашыя сябры! Проста „дзівосы і сьмяхоты", разьлічаныя на падобных Янку. А вось ён дык чысты — і да таго адным стрэлам забівае двох зайцаў—робіць данос, куды трэба, што тут „інтэрнацыяналістыя", а масам кажа, што Паўлюкевіч, Умястоўскі і Вярнікоўскі — нашы сябры! Проста глупота!

Падобныя ўзоры янкаўскай логікі бачым і ў іншых месцах стацьці, як „камунікаты памагаюць палякам", што супрацоўнік адзіны Савонь сам адмовіўся і т. п.

Але ўсё гэта—мізэрны фарс, ўсё яшчэ разьлічаны на нясьведамасьць працоўных гушчаў, а акторам у гэтым фарсе балаганны шут Янка Станкевіч, які пускае свае „штучкі" на пацеху публікі.

Ніхто на гэтыя „штучкі" паважна не глядзіць, а шэфы і скамарохі пэўна таксама хутка ўпэўняцца ў няўдачным выбары памочніка. Усе ведаюць, што ёсьць беларускія працоўныя гушчы, палітычна сьпелыя і аб'яднаныя каля Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу, які зьяўляецца выразіцелем іх імкненьняў. Еднасьць іх—залог перамогі. І ніякія фіглі балаганных шутоў ня здолеюць разьбіць гэтай еднасьці.

Наша еднасьць — наша сіла!

А бруд брудам і астанецца і ні да кога ня прыстане!

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Барацьба за родную школу і перамога.

(Вёска Вострава, Старавейскае воласьці, Слонімскага павету).

Навука ў роднай мове — гэта падстава існаваньня кожнае нацыі, бо без навукі ў роднай мове нацыя, як самастойная адзінка, ня можа існаваць, — яна духова як-бы памірае, ці падпадае пад уплыў, а часта і ў культурна-нацыянальную няволю, — дужэйшага свайго суседа. І вось наш народ зразумеў, што родная школа — задатак яго існаваньня й вось колькі ўжо гадоў гераічна вядзе змаганьне за родную школу, але вынікі? — архі-мінімальныя — бачым іх усе.

Наша вёска Вострава стаіць у тых радох змагароў, якія з нябывалаю самаахвярнасьцю йдуць дружна да раз азначанае мэты.

Ёсьць прымавіска: Хто працуе, — той, і мае за працу. Нарэшце і мы праз 3 гады цяжкага змаганьня, праз 3 гады думкаў, лятуценьняў аб роднай школе, нарэшце атрымалі „orzeczenie" ад п. Куратара, што будзе ў нас Беларуская ўрадовая І-кл. школа. Ня буду апісваць, як мы змагаліся — кожная сьвядомая вёска гэта ведае на практыцы. Кожны бацька, матка ці апякун былі настрашаны, каб адказаліся ад зложаных імі дэкларацыяў, паабівалі валасныя парогі, часта кланяліся варожым да нашае справы войтам, і не адзін папаў у сьпіскі „wywrotowców, antypaństwowców ды komunistów". Падам толькі кароткія статыстычныя дадзеныя аб зложаных дэкларацыях. Гэта, як нельга лепей, сьведчыць аб народнай сьведамасьці.

У 1925 г. зложана на 56 дзяцей — 37 дэкларацыяў. Адказ ад п. Інспэктара, каб, хоць дзеля фармалістыкі атрымалі. Не! Голас гукаючага ў пустыні. У 1926 г. ізноў зложылі на 52 дзяцей, па „zbadaniu" важных засталося на 36 дзяцей, рэшта — уняважнены і бацькам чаетка бацькоў адказаліся(?) ад зложаных сваіх дэкларацыяў. Дык, як ласку з неба, далі ўтраквістычную, але сяляне зразумелі карысьць з утраквістычнае школы ды ў адзін голас сказалі, жадаем роднае школы, „чыста беларускае". І вось у 1927 г. ужо 3-ці раз зложылі на 69 дзяцей дэкларацыяў. За гэты час, хоць была і польская школа, але бацькі куплялі сваім дзецям беларускія лемантары і іншыя кніжкі дый вучылі па дамам чытаць пабеларуску. Аб усіх важных здарэньнях пад час змаганьня за школу пісалі ў газэты.

Вось ужо атрымалі „orzeczenie" п. Куратара, што будзе „na rządanie rodziców dla 46 dzieci (а рэшта дзе? бо-ж было пададзена на 69 дзяцей, пэўне „зракліся" сваіх дамаганьняў, роднай школы?!) I-kl. szkoła, z językiem wykładowym białoruskim". Так, дзяцей у школьным веку ў вёсцы да 200, а школа толькі І-кл. Але-ж п. стараста (слонімскі) сам абяцаў нам, што будзе ІІ-кл., толькі трэба наняць памешканьне пад ІІ кл., але хай сяляне наймуць... „za własne pieniądze, dla tego że Sejmik Powiatowy niema w tym roku na to funduszów, tylko na przyszły rok weźmie". А на „kółki rolnicze, (для асаднікаў) strzeleckie" ды „Towarzystwu Domu Ludowego" пэўне ёсьць ды „zgóry". Але, нічога, добра і гэтак. Сяляне аднагалосна пастанавілі асыгнаваць па 2 зл. на наём памешканьня пад ІІ кл. Вось маем родную школу, ці прынамсі будзем мець, але надалей не пакінем працы, не апусьцім рук у задаваленьні цешачыся „лаўрамі" перамогі. Не! Бо яшчэ многа, мога трэба будзе за што змагацца, — лепшая будучыня ляжыць за цярністым шляхам. Бо школа будзе родная, а вучыцель? — Мо' беларус? Шчыры сялянскі вучыцель?—Сумліўна! дый ня маем надзеі. Пэўне галілеюш, ці пазнанчык (такога мелі), які скалечаны на Беларусі скасьць. Такі вучыцель шчырае свае веды й добрага выхаваньня нашым дзеткам ня дасьць.

Браты Беларусы! заклікаем усіх шчырым сялянскім словам: На школьны фронт! На барацьбу з цемраю, змагацца за асьвету ў роднай мове для працоўнае масы. Усе станавецеся ў сталёвыя рады культурна-асьветных змагароў, бо толькі даўгім і ўпорлівым змаганьнем здабудзем сабе школу. Няхай нашая гісторыя азначыць на сваіх старонках вогненна залатымі літарамі імёны Тых, хто сваею працаю дапамагае класьці хоць невялічкую цэгліну над вялікую будыніну — культуры — культуры для працоўных.

„Сэлэтэ".

„Анафэма".

(в. Вострава, Старавейс. вол., Слонімск. пав.).

Есьць у нашай царкве поп, Барыс Кірык, які толькі нядаўна высьвенціўся на духоўніка. Вось, гэтаму й даручана пасьці „оўцы". Прыход яго налічае 1.500 душ. Каб добра „пасьці" і „выхоўваць" сваіх авец, поп ня дбае! Не! Ён стараецца іх найбольш стрыгчы! Бо за вянец бярэ 50 зл. і болей, за хаўтуры 20—30 зл., за хрышчэньне 7 зл. Хадзіў з калядою і перад вялікаднем, дык абавязкава вымагаў каўбас і сала. Хто-ж адкажа, што няма, „бацюшка" заглядаў на печ, ці сохнуць мо' каўбасы, або ў сенях пад страху, ці што-небудзь вісіць. Надышло ў аднаго хлапца вясельле, і ён прыехаў вянчацца ў царкву, дык поп залупіў „пахрысьціянску", толькі 50 залатовак... Хлапец пасуліў 15 зл., бо болей ня меў. Але поп на гэта не згадзіўся і хлапец паехаў у Дзярэчын у касьцёл да ксяндза, які зьвянчаў за 15 зл.,—усё роўна, абы „фармальнасьць" збыць!

Пасьля гэтага а. Барыс казаў пропаведзь ды страшэнна лаяў усю востраўскую моладзь пекнымі „слоўцамі", якія брыдка сюды пісаць. Аднак, ужо стаў браць за вянец меней, 25—30 зл., баючыся, каб усе ня езьдзілі да ксяндза.

Але вось другі хлапец, Алесь Марчук, да папа зусім не зьвяртаўся, а проста паехаў да ксяндза, зьвянчаўся і квіта! Даведаўшыся аб гэтым, наш пастыр моцна абурыўся і на Усьпеньне сказаў вялікую рэлігійна-палітычную прамову — пропаведзь. Казаў, што, калі гэтак будзе далей, дык сяляне зьгінуць ад гневу божага, бо зьяўляецца бязверра і бальшавізм, з якімі трэ змагацца, ды, „торжественно" падняўшы крыж у гару, адлучыў А. Марчука ад царквы на 7 гадоў, кажучы тройчы праклянцьце: „Анафема яму, Анафема, Анафема"!

Н.

Панская расправа.

(в. Лобзава, Дзярэчын. вол., Слонім. пав.).

Есьць каля нашай вёскі двор і новы пан Гедройць, які купіў яго. Ад самага падзелу 1862 г. вёсцы дасталася паша ў колькасьці 31 дзесяцін. Старыя абшарнікі ня мелі да пашы жаднай прэтэнзіі, а пан Гедройць адразу патрабаваў частку пашы сабе,—як сэрвітутнае. Сяляне яму катэгарычна ў гэтым адмовілі. Справа была панам здана ў суд, які адсудзіў яму частку. Аднак і сяляне не закінулі гэтае справы і нерадал, ў суд нанова аб даўнасьці карыстаньня, бо больш як 60 гадоў яны самастойна гэтай пашай карысталіся.

25/VIII г. г. выязная сэсія Горадзенскага Акружнога Суда на мейсцы разглядала гэту справу і рабіла дапрос сьведак, якіх з розных суседніх вёсак было каля 20-ці. Як ведама, пастанова робіцца пасьля. Але пан Гедройць, чуючы сябе ў правох і не чакаючы рэзалюцыі суда, 28/8 г. г. прывёз каморніка п. Якубоўскага і пачаў рэзаць частку зямлі сабе. Якубоўскі самачынна напісаў паперку ў паліцыю, каб у патрэбе далі помач. Было выслана 2-х пастарунковых. Сяляне, бачучы бясправўе, пачалі не даваць рэзаць, трэбуючы пастановы суда, Акружной Камісіі земскай у Горадні ці „polecenia" земскага камісара. Паліцыя паказвала толькі запіску каморніка, — а каморнік што, цікава, пакажа?

Вось каб...

Вось каб я быў вучоным Ньютонам, дык адразу адкрыў-бы закон прыцяганьня паноў да чужых грошаў, а сялян да навукі. Вось дзіўна, — амаль ня ў кожным нумары газэты чытаем аб „defraudacji" і амаль ня ў кожнай газэце чытаеш аб тым, што сяляне саматугам закладаюць бібліятэкі, ставяць спэктаклі, ня гледзячы на тое, што школаў ім не даюць. Зладзейства ўвайшло ў сэрцы ўрадоўцаў і стала для іх нейкай новай сыстэмай.

Нядаўна сэквэстратар у Гараднянскай гміне назьбіраў з сялян каля 2000 зл. і ўцёк, як у воду ўпаў. Вось, каб мне знайсьці які „system" для палёгкі жыцьця, павялічэньня веды, дасягненьня ўсяго таго, аб чым лятуцім. Вось добры быў-бы такі „system" для нас!..

Сумуючы.

НАМ ПІШУЦЬ:

× **М-ка Астрыня, Лідзкага пав.** У нашым м-ку хоць каталікоў вельмі мала (толькі ўрадоўцы), але і яны захацелі пабудаваць касьцёл. Для гэтай мэты яны хацелі захапіць магазын. Сяляне гэтага не дазволілі, дык яны падалі ў суд, а каб было дзе „прэклоніцца", яны зрабілі касьцёл у школьнай салі. Вось табе маеш! Замест асьветы, якую павінна была-б даваць школа, яны яе захопліваюць пад касьцёл. Сяляне ўсімі сіламі павінны дабіцца школы і то ў роднай мове.

× **Пружаншчына.** У м-це Пружаны 12/VII 1928 г. быў хвэст. Будучы там, я пабачыў вялікі натоўп людзей каля царквы, пераважна жанчын. Сталі яны, каля толькі што прысланых званоў, якія прадстаўлялі штосьці бязхворменнае ад сялянскіх ручнікоў, палотнаў, хустак і іншага дабра, якімі былі ўвешаны гэтыя званы. Некаторыя нясьлі, магчыма, апошняе, але „для бога", як вучаць „айцы".

Дык сяляне! Ці-ж не пара працерці вочы? Ці-ж мы яшчэ дагэтуль ня ведаем, у чыю кішаню пойдзе ўсё гэтае дабро. А нам прыйдзецца чакаць „раю" або „манны з неба", працуючы і галадуючы.

× **Вёска Азіраўцы, Браслаўскага пав.** На шляху ад маёнтку Бэльмонт да м-ка Браслаўя ляжаць вёскі Ахрэмаўцы і Азіраўцы. Дарога гэтая вельмі мокрая ў часе дажджоў. Бэльмонцкаму абшарніку ды браслаўскім урадоўцам гэта вельмі не падабаецца, бо яны маюць аўтамабіль, якім штодня езьдзяць з Бэльманта да Браслаўя і наадварот. А ведама, аўтамабіль скаціна такая, што па балоце ня едзе. Дык, каб аўтамабіль мог ехаць, п. Стараста загадаў Ахрэмаўцам ды Азіраўцам брукаваць свае вёскі. Сяляне адказаліся, кажучы, што на тое плоцім „дроговэ" падаткі, каб самім не рабіць дарог. Але „начальства", відаць, на—гвалт хоча, каб сяляне і падаткі плацілі і дарогі рабілі, бо вось па загаду „z góry" солтыс у Азіраўцах апісвае кароў, коней, сьвіней, авечак, сена ды інш. рэчы, за тое што сяляне ня возяць каменьне брукаваць дарогу.

Няўжо-ж законы дазваляюць панам гэтак зьдзекавацца над сялянамі?

× **Сьвянцяншчына.** Вайсковае асадніцтва на „крэсах" збанкрутавала ў сэньсе палянізацыі беларускага сялянства. На падмогу ў гэтым кірунку ідзе цывільнае асадніцтва. Робіцца гэта так:

Прадаецца маёнтак. Зараз-жа прыяжджае з Варшавы ці Вільні нейкі пан, купляе яго агулам за свой „ўласны" капітал, парцэлюе яго на кускі, якія ацэньвае ў тры ці чатыры разы болей, чым сам заплаціў. Ведама, што так дарага ацэненую зямлю бел. селянін ня можа купіць. Вось яны прывозяць польскіх сялян з каранной Польшчы, якія, дзякуючы таму, што там зямля вельмі дарагая, купляюць надзелы, можа пераплачваючы, ведама маючы крэдыты ў польскіх банках.

Ці ўдасца гэты „новы курс"? Пажывём—пабачым!

× **Вялейшчына.** Кепскае наша жыцьцё, нэндза, цямнота наўкола, і з гэтае цямноты карыстаюць нашы ворагі — капіталісты і абшарнікі.

Працуй, гні сьпіну цэлы год, а прыдзе час, што і галодны сядзі і апошняга коніка за надаткі аддавай.

Да гэтага імкнуцца і капіталісты і абшарнікі і іх верныя служкі сацыял—здраднікі і ўрэшце „айцы" духоўныя.

Вось прыклад таго, як „пабожаму" абходзяцца „блажэнныя" з беднымі работнікамі. Вязенскі поп М. Сьмірноў, каб лепей скарыстаць з працы свайго работніка, увёў асобны „каляндар" яшчэ дасюль ня чуваны.

Наймаючы на месяц работніка, поп яму ня лічыць працяг месяца так, як усе людзі, а выключна 30 дзён працы. Такім чынам, калі ў працягу месяца сустракаецца напр. 7 ці 8 дзён сьвят, дык поп іх да месяца не залічае, а работнік мусіць адрабіць гэтыя 7 ці 8 дзён у працягу другога месяцу. Вось дзе праўда папоўская. Сапраўдная „любовь ближнего".

Усячына.

Сьвята чэхаславацкай каапэрацыі.

20-га траўня адбылося ў Празе-Чэскай вялікае народнае сьвята. У гэты дзень чэскі і славацкі народы ўрачыста абходзілі 30 угодкі свае зямляробскае каапэрацыі. На сьвята ў Прагу зьехаліся тысячы прадстаўнікоў чэскага, славацкага і мараўскага сялянства, каб на гэтым урачыстым Зьезьдзе падрахаваць тое, што зроблена імі пры помачы каапэрацыі за апошнія 30 гадоў—ад той хвіліны, калі занявольны тады чэскі народ стаў на шлях самастойнай адбудовы свайго гаспадарчага быту, каб перагледзець пройдзены шлях, параўняць мінулае з сучасным, і каб набраць сілы на будучыню.

Вялізарную працу выканаў чэскі народ за гэты час. З невялічкіх таварыстаў, паўстаўшых тады з мэтаю самапомачы, вырас магутны сацыяльна-гаспадарскі рух, які высока падняў стан сялянскай гаспадаркі, узгадаваў свае грамадзянства, узмацніў у іх дух грамадзкасьці, а тым самым значна прычыніўся і да справы здабыцьця незалежнасьці.

Распачынаючы 30 гадоў назад каапэратыўную працу, чэскі народ быў у палажэньні вельмі сходным з тым, у якім знаходзімся ў сучасны момант мы—беларусы і дзеля гэтага справа чэхаславацкай каапэрацыі павінна нас зацікавіць.

У адным з наступных нумароў дамо нашым чытачом магчымасьць пазнаёміцца з разьвіцьцём і здабычамі, як зямляробскай каапэрацыі Чэхаславаччыны, так і яе спажывецкай каапэрацыі, якая 16 чэрвеня таксама ўрачыста абходзіла 20 угодкі свайго існаваньня.

Закладайце свае, беларускія, каапэратывы.

Каапэрацыя — гэта шлях да перабудовы грамадзкага ладу на новых, больш справядлівых падставах.

Каапэрацыя — гэта адзін з відаў сацыяльнай барацьбы працоўных за лепшую будучыню.

Дык тавары каапэрацыю і абмінай прыватнага гандляра, як заразу!

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Рэдактар-Выдавец: П. Пяткун.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.